ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

31 1933 г. АЎТОРАК № 241 (4785) Год выдання XVII

СЕННЯ У НУМАРЫ:

ЮБІЛЕЙНЫ ПЛЕНУМ ЦК УсеЛКСМ тав. СТАЛІНУ.

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Галоўны ўлор—на змест работы калгаснага партзвяна. П. ГОРЫН.—Крызіс капіталізма і загніванне буржуазнай гістарычнай навукі.

ПАСТАНОВА КАЛЕГІІ НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТА ЗЯМЛЯРОБСТВА БССР АБ РАЗМЕРКАВАННІ УРАДЖАЮ І ДАХОДАЎ У КАЛГАСАХ ЗА 1933 г.

6-га лістапада — фініш перадкастрычніцкай пераклічкі.

10 ГОД ТУРЭЦКАЙ РЭСПУБЛІКІ.

Правакацыі белагвардзейцаў у Харбіне.

Тав. Літвінаў у Нейрата.

Аб правядзенні XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі—Пастанова ЦК КП(б)Б.

Тав. СТАЛІНУ

Прывітанне юбілейнага пленума ЦК УсеЛКСМ

ДАРАГІ ІОСІФ ВІСАРЫОНАВІЧ!

У сваім прывітанні мы хочам выказаць вам гарачую любоў і глыбокую пашану, з якімі зварнуты да Вас—настаўніка і правадыра—умы і сэрцы ленінскага комсамола і ўсяго маладога пакалення нашай краіны.

З самага пачатку развіцця юнацкага комуністычнага руху Ленін і вы—самы пепшы і адданы яго вучань і правадаўжальнік яго справы—выхоўвалі пра цоўную моладзь Совецкага Саюза і яе перадовы атрад—ленінскі комсамол—у духу комунізма, у духу дыктатуры пролетарыята.

Уся гісторыя прайшоўшых 15 год, усе вялікае і моцнае, што завяёвана намі на гэтым шляху—з'явілася поўным пацвярджэннем вашага ўказання, што галоўнае ў рабоце комсамола—гэта кіраўніцтва большэвіцкай партыі.

Вы кіравалі шостым з'ездам партыі, распрацоваўшым праграмна-арганізацыйныя задачы Комуністычнага саюза моладзі.

Вы ўзбройвалі нас, непахісна рашучасцю аўладаць вышынямі марксіцка-ленінскай тэорыі. Вашы работы па далейшаму развіццю марксіцка-ленінскага вучэння ярка паказваюць нам, што тэорыя—не догма, а баявая зброя.

Ваш прыклад барацьбы, ваш шлях большэвіка служыць для нас лепшым узорам беззаветнай адданасці і веры ў сілы рабочага класа, большэвіцкай партыйнасці, дысцыпліны, ленінскай прынцыповасці, сталёвай несакрушальнай волі, злучэння рэволюцыйнага размаха з настойлівай дзелавітасцю большэвіка-будаўніка.

Вы падымалі нашу пільнасць, узбройвалі нас непрымірымай нянавісцю да класавага ворага, выхоўвалі нас у духу салідарнасці з сотнямі мільёнаў кашых братоў і сясцёр на Захадзе і Ўсходзе.

В. І. Ленін і вы вялі нас у баі за пролетарскую дыктатуру, за знішчэнне класаў і пабудову соцыялізма. Вы падымалі нас на барацьбу за смепую большэвіцкую самакрытыку.

Вы ўзбройвалі нас на непрымірымую барацьбу супроць контр-рэволюцыйнага троцкізма і яго «лявацкага» хвосця, супроць правых апартуністаў, супроць прымірэнцаў, супроць усіх хто прабаваў сяць няверые, замашанасць і паніму ў нашы рады, хто прабаваў падарваць жалезнае адзінства старой і маладой гвардыі большэвізма, хто прабаваў адцягнуць комсамол ад класавых баёў.

Вам—любімаму другу, настаўніку і правадыру—мы даём слова маладых большэвікоў і надалей быць непахіснымі, ударным атрадам у барацьбе за бясклассавае соцыялістычнае грамадства.

Клянемся—

яшчэ вышэй падняць творчую энергію і энтузіязм моладзі на оўладанне тэхнікай, навукай, на барацьбу за большэвіцкія калгасы, за заможнае калгаснае жыццё.

Клянемся—

высока трымаць сцяг ленінскага інтэрнацыяналізма, бясстрашна змагацца за знішчэнне эксплаатацыі чалавека чалавекам, за сусветную пролетарскую рэволюцыю

Клянемся —

і надалей быць самымі вернымі памочнікамі нашай любімай партыі.

Клянемся —

яшчэ настойлівей мацаваць магутнасць пролетарскай дыктатуры; мацаваць абарону соцыялістычнай бацькаўшчыны, падрыхтоўваць новыя сотні тысяч прыкладных байцоў—звышметкіх стралкоў, бясстрашных лётнікаў, адважных маракоў, танкістаў і артыперыстаў, у дасканаласці ўладаючых вазкай тэхнікай.

Клянемся—

дабіцца, каб слаўныя большэвіцкія традыцыі сталі нашым целам і крывёю.

Клянемся —

быць дастойнымі сынамі і дочкамі нашай вялікай мацеры—комуністычнай партыі большэвікоў.

Ленінскі комсамол ганарыцца тым, што пад сцягам Леніна, з вамі, пад вашым геніяльным кіраўніцтвам працоўная моладзь краіны будуючагася соцыялізма мае шчасце свабодна жыць, змагацца і перамагаць.

Няхай жыве наша магутная непераможная большэвіцкая партыя!

Няхай жыве наш вялікі правадыр і тварэтык сусветнага пролетарыята тав. СТАЛІН!

АБ УЗНАГАРОДЗЕ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА КІРАЎНІКОЎ І ПЕРАДАВЫХ РАБОТНІКАЎ КОМУНІСТЫЧНАЙ МОЛАДЗІ

Пастанова прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР

МАСКВА, 29. (БЕЛТА). У адзнаку XV-годдзя Усесаюзнага Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Узнагародзіць ОРДЭНАМ ЛЕНІНА наступных кіраўнікоў і перадавых работнікаў комуністычнай моладзі ў Саюзе ССР:

1. КОСАРАВА — выпрабаванага кіраўніка ленінскага комсамола, выдатнага арганізатара комсамольскіх мас у іх барацьбе пад кіраўніцтвам партыі за перамогу пяцігодкі.

2. САЛТАНАВА — сакратара ЦК УсеЛКСМ, аднаго з лепшых арганізатараў рабоча-сялянскай моладзі.

3. ЛУК'ЯНАВА — сакратара ЦК і МК комсамола, аднаго з лепшых прадстаўнікоў рабочай моладзі Масквы, прызнанага кіраўніка маскоўскага комсамола.

4. ГАРШ�эНІНА — ваеннага сакратара ЦК УсеЛКСМ, старога комсамольца уральскай арганізацыі, былога камандзіра часоў грамадзянскай вайны.

5. ШАРЫПАВА — сакратара ЦК УсеЛКСМ, віцэнайшага прадстаўніка рабоча-сялянскай моладзі Узбекістана, кіраўніка комсамола Узбекістана.

6. АНДРЭЕВА — сакратара ЦК комсамола Украіны, старога комсамольскага работніка, не раз праявіўшага на цяжкіх участках свае арганізатарскія здольнасці.

7. ВАСІЛЬЕВА — старога работніка маскоўскай арганізацыі комсамола, умела мабілізаўшага масы моладзі на барацьбу за правядзенне дырэктыў партыі.

8. ВАСІЛЬЕВУ — работніцу-ткэстыльшчыцу з 11-гадовым вытворчым стажам, здольную работніцу маскоўскай арганізацыі комсамола.

9. СЕВЕР'ЯНАВУ—работніцу, комсамолку маскоўскай арганізацыі, адну з лепшых работнікаў комсамола ў піянерруху.

10. ВАЙШЛЯ—кіраўніка ленінградскага комсамола, умела мабілізуючага комсамольскія масы на выкананне прам фінплана.

11. ПЕРСІЦ І. — сакратара маскоўскага гаркома комсамола, актыўнага арганізатара моладзі Масквы за ўпраўленнем пролетарскай сталіцы.

12. ГРЫГОРАН Г. В. — сакратара Закаўказскага крайкома комсамола, старога комсамольскага работніка, умела праводзіўшага на практыцы ленінскую нацыянальную палітыку.

13. ГРОМАВА І. А. — памочніка начальніка чыгуначнага цэха завода «Большэвік» (Ленінград), рацыяналізатара, аднаго з арганізатараў ударных брыгад, умела арганізуючага вытворчасць на адзначым участку завода, некалькі разоў праявіўшага.

14. КАШАНАВА Ф. А. — ударніка завода № 2 (Каўроў), слесара-лекальшчыка, рацыяналізатара і вынаходца, актыўнага барацьбіта за дысцыпліну на вытворчасці, актыўнага грамадскага і комсамольскага работніка.

15. БЫЖАВУ К. Ф. — лепшую ўдарніцу, брыгадзіра фабрыкі імя Дзержынскага (Іванава), сістэматычна перавыконваўшую, пачынаючы з 1928 года прамфінплан, увесь час працуючую без брака, прамяіваную 25 разоў. Актыўную комсамолку на фабрыцы.

16. АНДРЭЕВА М. Г. — слесара-зборшчыка, арганізатара ўдарных брыгад на заводзе імя Марці (Ленінград), вынаходца, тры разы прамяіванага, актыўнага комсамольскага работніка.

17. ЮДЗІНА — майстра завода шарыкападшыпнікаў імя Л. М. Кагановіча (Масква), брыгадзіра комсамольска-моладзьнай брыгады, на самым трудным тыпе шарыкаў, сакратара цэхавай ячэйкі комсамола.

18. БУЖУРЫНА М. А. — брыгадзіра лепшай моладзьнай брыгады з-да імя Менжынскага (Масква). (Яго брыгада на працягу двух год сістэматычна выконвае і перавыконвае прамфінплан і не дае ні аднаго процента брака), сакратара цэхавай ячэйкі комсамола, якая з'яўляецца адной з перадавых на заводзе.

19. СВІРЫДАВА Г.—брыгадзіра мартэнаўскай печы завода «Серп і молот» (Масква) не раз прамяіванага, сістэматычна перавыконваючага прамфінплан.

20. ПЕРОВУ К. А. — работніцу першай ткацкай фабрыкі Арэхава-Зуева, ткачыху, лепшага брыгадзіра моладзьнага камплекта па ўсяму Арэхава-Зуеву, члена пленума арэхава-зуеўскага гаркома комсамола.

21. РАМАНЬКО Е. — арганізатара першай комсамольскай жаночай брыгады бетоншчыкаў на Дняпрабудзе, сістэматычна перавыконваючую праграму па кладцы бетона, дасягнуўшую сусветных рэкордаў.

22. СЦЕПАНЕНКА А. — забойшчыка шахты № 1 (Горлаўка), лепшага малодога забойшчыка Донбаса, сістэматычна перавыконваючага норму выпрацоўкі, сакратара падземнай ячэйкі комсамола ўчастка № 7, першага і лепшага вучня Нікіты Ізотава.

23. ШКЛЯР Т. І. — маладога інжынера, намесніка начальніка мартэнаўскага завода імя Сталіна на Украіне, показаўшага сябе, як харошага арганізатара і буйнога спецыяліста, за бліскучую работу і арганізацыю мартэнаўскай вытворчасці пяць раз прамяіванага, маючага за сваю работу падзяку ад калегіі Наркамцяжпрама.

24. ТУГАЙ К. — слесара ХПЗ імя Комінтэрна (Харкаў), лепшага маладога ўдарніка, рацыяналізатара і вынаходніка, арганізатара ўдарнай комсамольскай гаспадарча-разрахунковай брыгады, аднаго з кіраўнікоў зборкі матора БД-2, члена заўкома.

25. МІШУГЛІ — былога батрака, зараз члена калгаса імя Катоўскага (Адэская вобласць), лепшага ўдарніка калгаснай вытворчасці, показаўшага высокія ўзоры прадукцыйнасці працы і найлепшай якасці работы, арганізатара комсамольскай дружыны па ахове ўраджаю.

26. ВАСІЛЬЕВА — рабочага Пуцілаўскага завода, аднаго з першых арганізатараў комсамольскай брыгады вальцоўшчыкаў.

27. ПАНЧЭНКА Р. Ф. — калгасніка, чырвонаармейца першага кавалерыйскага дывізіёна Харэзмскага палка (Сярэдняя Азія), удзельніка баёў з бандамі ў Кара-Куме.

28. КАРПАВА А. К. — рабочага, комсамольца, камандзіра групы тарпедыстаў падводнай лодкі «Ерш», звыштэрміноўшчыка, узорнага камандзіра, сакратара партыйнай ячэйкі падводнай лодкі.

29. СУЗІ Т. П. — камандзіра і камісара знішчальнага атрада авіябрыгады, рабочага, з 1918 года добраахвотніка ў Чырвонай арміі, маючага вялікага камандзіра, энтузіяста лётнай справы.

30. ДОСІНА А. І. — машыніста дэпо Менск, дзяжурнага па дэпо, тры разы прамяіванага за ўзорную работу як машыніста, актыўнага грамадскага работніка.

31. ОСТАШКА Н. — работніцу віцебскай швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», ударніцу, тры разы прамяіваную за перавыкананне норм і ўзорную якасць, арганізатара моладзьнай іскрыкі, лепшую ўдарніцу па оўладанні тэхнікай, члена гаркома комсамола.

32. ВАФІН Н. — рабочага пошыўчнай фабрыкі (Казань), слесара-механіка, вынаходцу, не раз прамяіванага за ўзорную работу на вытворчасці, члена бюро Пролетарскага райкома комсамола.

33. ХАНМУРАДАВА — брыгадзіра, ударніка промысла імя Орджанікідзе ў Баку, тры разы прамяіванага, актыўнага комсамолца.

34. ЗАКАРЭЙШВІЛІ — рабочага, слесара парэвоза-рамонтнага завода імя Сталіна ў Тыфлісе, комсамольца з 1926 года, актыўнага ўдарніка.

СТАРШЫНЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА САЮЗА ССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА САЮЗА ССР
А. ЕНУКІДЗЕ.

29 кастрычніка 1933 г.
Масква, Крэмль.

ГАЛОЎНЫ УПОР—НА ЗМЕСТ РАБОТЫ КАЛГАСНАГА ПАРТЗВЯНА

Ужо больш трох месяцаў як у **Беларусі** пачалася перабудова вясковых партыйных ячэек па вытворчаму прынцыпу. На сёнешні дзень арганізацыйная работа ў асноўным закончана. Побач з тэрытарыяльнымі сельсаветскімі ячэйкамі (там, дзе яны засталіся) створана шырокая сетка вытворчых калгасных ячэек, кадыдацкіх груп, партыйна-комсамольскіх атрыў і гарторгаў.

Трэба адзначыць, што гэта работа праійшла не без супраціўлення з боку асобных райкомаў, сельсаветскіх ячэек і частка комуністаў. У некаторых месцах не зразумелі ўсёй важнасці гэтага мерапрыемства, не зразумелі таго, што **стварэнне побач з тэрытарыяльнымі вытворчых партыйных ячэек ёсць далейшая канкрэтызацыя рашэнняў студзеньскага пленума ЦК УсеКП(б) аб узмацненні кіраўніцтва сельскай гаспадаркай і стварэнні ў сувязі з гэтым палітаддзелаў.**

Вось некалькі фактаў. **Лёзненскі** райком доўгі час зусім не прыступаў да перабудовы і толькі тады, калі ЦК КП(б)Б патрабаваў справаздачы, сакратар райкома тав. **Мінкаў** за адну ноч, сядзячы ў кабінеце, «перабудаваў» на паперы партыйныя ячэйкі. У **Сіроціне** сярод кіруючых работнікаў панавала думка, што перабудова партарганізацыі па вытворчаму прынцыпу прыводзе да распылення партыйных сіл і аслаблення партыйнай работы ў вёсцы. Такія па сутнасці антыпартыйныя разважанні ёсць проста вынік незразумення сутнасці і задач перабудовы. І нават зараз, калі арганізацыйная перабудова партыйнай сеткі ў асноўным ужо скончана, гэта неразуменне ў радзе раёнаў яшчэ моцна адчуваецца.

Асобныя райкомы партыі, перабудаваўшы арганізацыйна партыйныя ячэйкі, парашылі, што галоўнае ўжо зроблена. На самой справе перабудова структуры партыйных ячэек ёсць толькі пачатак работы. Галоўнае зараз заключаецца ў тым, каб пна набудаваныя партзвенні па-новаму перабудавалі і метады сваёй работы і кіраўніцтва.

Трэба зразумець, што стварэнне новых партыйных аддзілак непасрэдна ў калгасах (ячэйкі, партыйна-комсамольскія ядры і картарганізатары) патрабуе новых форм і метадаў кіраўніцтва імі з боку раённых камітэтаў партыі і палітаддзелаў. Калі раней райкомы партыі мелі справу з дзесяткам сельсаветскіх тэрытарыяльных ячэек, то зараз перад імі сот ні рознастайных форм партыйных звенняў.

Ці можна кіраваць гэтымі шматлікімі партыйнымі звенняжмі старымі формамі і метадамі? Ні ў якім разе. Сістэма ўнаўпавяжаных, якіх раней насылаў райком у сельсаветскія ячэйкі, павінна быць адкінута як непатрэбная справа. Райкомы, а ў зоне дзейнасці МТС палітаддзелы павінны непасрэдна кіраваць ячэйкай. Між тым большасць райкомаў партыі ўсё яшчэ арыентуюцца на сельсавет, зусім забываюць аб парторгах і партыйна-комсамольскіх ядрах у калгасах. Ёсць выпадкі, калі райкомы партыі патрабуюць ад старшынь сельсаветаў—комуністаў справаздач, як працуюць парторгі калгасаў у раёне сельсавета.

Гэта гаворыць аб тым, што старыя традыцыі кіраваць толькі праз тэрытарыяльную ячэйку яшчэ вельмі моцныя. З гэтымі традыцыямі неабходна пакончыць. **Сакратар калгаснай партыйнай ячэйкі, кіраўнік кандыдацкай групы, партыйна-комсамольскага ядра, парторг—вось жывыя людзі, з якімі райком партыі і палітаддзел павінны непасрэдна мець справу.**

Як станоўчы вопыт у гэтых адносінах, трэба прывесці **Чавускі** раён. Там райком партыі і палітаддзел МТС вельмі хутка адмовіліся ад старых форм і метадаў кіраўніцтва і знайшлі новыя. **Перабудаваўшы партыйную сетку па вытворчаму прынцыпу, яны адразу-ж разбілі ўсе нізавыя партзвенні па кустах, да якіх прымацавалі членаў бюро райкома, прэзідыума райКК і работнікаў палітаддзела.** Гэтыя прымацаваныя, паміма штодзённага кіраўніцтва работай кожнага партзвяна ў паасобку, сістэматычна два разы ў месяц праводзяць куставыя нарады парторгаў, атрыўкоў партыйна-комсамольскіх ядраў, кандыдацкіх груп і сакратароў калгасных ячэек. Выклікаюцца кіраўнікі нізавых партзвенняў і на бюро райкома для дакладаў аб становішчы работы.

Трэба сказаць, што вопыт чавускага райкома заслугоўвае ўвагі і яго неабходна перанесці на ўсе раёны. Арганізаванасць патрэбна самая рашучая барацьба з **тэндэнцыямі ператварыць гэтыя кусты ў тэрытарыяльнае сярэдняе партыйнае звяно. Куставыя нарады павінны з'яўляцца нічым іншым, як адной з форм работы прымацаваных, якія адказваюць за сваю работу перад райкомамі, а ў раёне дзейнасці МТС—перад палітаддзеламі.**

Аднак, было-б зусім няправільна звесці ўсю работу прымацаваных толькі да перыядычнага правядзення куставых нарад. Прымацаваны павінен аказваць дапамогу сакратару калгаснай ячэйкі, кіраўніку кандыдацкай групы, асабліва партыйна-комсамольскага ядра, і парторгу ў правядзенні штодзённай работы ў калгасе: арганізацыя і правядзенне партдня і палітдня і інш.

Асабліва ўважлівую дапамогу трэба аказваць комсамольскім ячэйкам. Калі арганізацыйная перабудова нізавой партыйнай сеткі ў асноўным закончана, дык комсамольская сетка толькі што пачынае перабудоўвацца. Несумненна, што вялікая доля віны ў гэтым падае на райкомы партыі.

Мірыцца з такім становішчам ні ў якім разе нельга. **Разрыў паміж перабудовай партыйнай работы і комсамольскай павінен быць неадкладна ліквідаваны.** Гэтага можна дасягнуць толькі тады, калі ЦК і райкомы комсамола сур'ёзна займуцца пытаннем перабудовы комсамольскай работы, калі райкомы партыі возьмуць гэту перабудову пад сваё непасрэднае кіраўніцтва.

Правядзеныя міжраённыя куставыя нарады па пытанню перабудовы партарганізацый у вёсцы выявілі шмат істотных недахопаў. **Задача заключаецца ў тым, каб на-хаду іх ліквідаваць, каб узняць на вышэйшую ступень змест партыйнай работы і партыйнага кіраўніцтва калгаснай вытворчасцю.**

Ні адной мінуты далейшай маруднасці з зяблівам
ЗАРАЗ-ЖА, ПОУНАСЦЮ І ДОБРА ВЫКАНАЦЬ ПЛАН

Белільнатрактарацэнтр на паваду ў чужакоў

САКРЭТ „БРУТТО" і „НЕТТО"

У зводцы дзве графы: «брутто» і «нетто».

Нам тлумачаць:

—«Брутто» — гэта агульная колькасць адпрацаваных трактарагадзін. «Нетто» — гэта колькасць карысных гадзін работы трактараў.

Сугастаўленне гэтых двух граф дае малюнак работы трактарнага парка **БЕЛІЛЬНАТРАКТАРАЦЭНТРА**. Малюнак абурачы!

ЧАШНІЦКАЯ МТС. 28 трактараў за другую дэкаду кастрычніка згодна зводкі «адпрацавалі» 5.185 гадзін. Гэта ў графе «брутто». Але побач у графе «нетто» стаіць лічба 1.034. Гэта значыць, што з 5.185 «адпрацаваных» гадзін, карысных было толькі 1.034. Інакш кажучы 4.151 гадзіна — 80 проц. часу — пайшло на заезду і запраўку трактараў, халастыя перагоны і т. д.

І гэта ў **ІЛЬНАТРАКТАРАЦЭНТРЫ** называюць «работай»

Возьмем **ГАРАДОЦКУЮ МТС.** 32 трактары «адпрацавалі» 3.104 трактарагадзін, з іх карысных толькі 1.169.

ГОРАЦКАЯ МТС—36 трактараў, 3.461 трактарагадзін, з іх карысных толькі 1.381. І гэтак далей на большасці МТС.

Усяго па ільнатрактарацэнтры з 10 да 20 кастрычніка з 34.625 «адпрацаваных» трактарагадзін карысных было толькі... 17.730. 50 проц. працуючай масы патрачана ўпустую. Такі сакрэт «брутто» і «нетто».

ПРАСТОІ ТРАКТАРАЎ СТАЛІ СІСТЭМАЙ

Да гэтага трэба дадаць велізарныя прастоі трактараў па розных іншых прычынах (прагулы трактарыстаў, паломкі, несвоячасовы падвоз гаручага і г. д.). Даволі паказаць, што па адной **ДРЫСЕНСКАЙ МТС**, якая лічыцца лепшай, за другую дэкаду кастрычніка колькасць прастояў дасягае 67 трактарадзён.

Прастоі трактараў сталі сістэмай.

Гэта ў самы разгар зяблева, калі павінна быць дорага кожная гадзіна! Гэта не гледзячы на катэгарычную дырэктыву ЦК КП(б)Б аб максімальным скарыстанні трактарнага парка на зяблеве!

Таму не дзіўна, што зяблева ў калгасах МТС ганебна зрываецца. На 25 кастрычніка ўзарана ўсяго 35.280 га — 20 проц. плана, пры чым трактарамі ўзарана толькі 7.092 га, або 13,7 проц. плана. На радзе МТС процант зяблева яшчэ болш ніжэй. Напрыклад, па **ЧАШНІЦКАЙ МТС,** узарана 8,2 проц., па **МЕХАЎСКАЙ** 11,7 проц., **СУРАЖСКАЙ**—13 проц., **СІРОЦІНСКАЙ**—14,1 проц. **РАСОНСКАЙ**—12,7 проц. і г. д.

Пастанова ЦК КП(б)Б аб пераводзе не менш 80 проц. трактарнага парка на зяблева ігнаруецца. З 694 трактараў па сістэме Белільнатрактарацэнтра на зяблеве працуюць толькі 247. Па **КРУПСКАЙ МТС** з 20 трактараў на зяблева пераведзен толькі 1 трактар, па **БОРКАВІЦКАЙ** з 23 трактараў—3, па **УШАЦКАЙ** з 20—4, па **ДРЫСЕНСКАЙ** з 21—4 і інш.

Але і гэтыя трактары фактычна больш стаяць, чым працуюць. Назвот паводле даных самога Белільнатрактарацэнтра выходзіць, што замест сярэдняй нормы ў 1,6 га кожная машына падымае ў дзень толькі 0,64 га.

На сутнасці зяблева поўнасцю пакінута на самацёк. Ніякага кіраўніцтва, ніякіх практычных указанняў МТС ільнатрактарацэнтр не даваў.

1-га жніўня давяді план зяблева да МТС і на гэтым супакоіліся да... 22 кастрычніка, калі стала ўжо зусім ясна, што работа правалваецца.

Тады кіраўніцтва пачала самазастрахавацца: у МТС дасылаецца новая штампаванная дырэктыва «усім, усім, усім», дзе канстатуецца, што ход зяблевага ворыва па калгасах зрываецца і прапануецца: «у двухдзённы тэрмін склесці штодзённае задание па ворыву і давесці да калгасаў і брыгад».

Толькі 22 кастрычніка Белільнатрактарацэнтр двума словамі намякнуў аб калідарным плане работы, пра неабходнасць у першую чаргу ўспімаць зяблева пад лён!

Так «кіруюць» работай трактарнага парка, які з'яўляецца асноўнай вытворчай базай МТС. Фактычна кіраўніцтва зусім няма. Ды і не можа быць яго, паколькі ільнатрактарацэнтр працуе літаральна ўслепую.

Што робіцца на месцах, як скарыстоўваюцца машыны і людзі — кіраўнікі трактарацэнтра не ведаюць. Праўда, фармальна зводкі складаюцца, на гэта не шкадуюць ні паперы, ні сродкаў, але робіцца гэта толькі для выгляду.

На справе-ж весткі аб рабоце трактарнага парка рэгулярна складаліся ў пасткі і ніхто імі не цікавіўся. Ні дырэкцыя, ні апраўтворчы сектар ні разу не займаліся аналізам работы трактарнага парка, не правяралі сапраўднага становішча на месцах. Характэрна, што да гэтага часу ў Белільнатрактарацэнтры нават не падведзены вынікі скарыстання трактараў за вясну і лета.

ДА ЧАГО ПРЫВОДЗІЦЬ ПРЫТУПЛЕННЕ КЛАСАВАЙ ПІЛЬНАСЦІ

Такава «сістэма» работы Белільнатрактарацэнтра.

Хто-ж праводзіў і праводзіць гэтую «сістэму»?

На чале апраўтворчага сектара да апошніх дзён стаяў апраном **БЯЛІНСКІ** — шкоднік, якому ўдалося ўлезці ў давер'е палітычна блізарукага кіраўніцтва.

Бялінскі хітра вёў сваю шкодніцкую палітыку. Яго стаўка была на тое, каб забыткаць улік, утаіць сапраўднае становішча трактарнага парка. Ён дабіваўся найменшага эфекта работы трактарнага парка з тым, каб скампрамітаваць ідэю маналізацыі сельскай гаспадаркі, каб дыскрэдытаваць МТС перад калгаснымі сялянствам.

Простым дасамножнікам Бялінскага з'яўляўся старшы эканаміст апраном **КЛОК**, які, на жаль, і дагэтуль яшчэ працуе ў апараце Белільнатрактарацэнтра. Клок па сутнасці працягвае палітыку Бялінскага, ён і зараз злосна сабатуе ўлік і аналіз работы МТС, добра ведаючы, што ад гэтага залежыць ліквідацыя прарыва.

У апараце Белільнатрактарацэнтра доўгі час знаходзілі сабе прытулак класава-варожыя элементы. Сектарам улікА загадваў **НАВІЦКІ**—былы царскі чыноўнік, заядлы вораг совецкай улады. У планава-фінансавым сектары арудваў сын былога буйнага капіталіста лесапрамысловцы **ШКОЛЬНІК**, які таксама імкнуўся дэзарганізаваць работу.

Вось дзе карэнні зрываў работы.

Адказнасць за гэтыя прарывы нясе дырэкцыя Белільнатрактарацэнтра, якая аказалася на поводзе ў класава-варожых элементаў. Дырэктар Селіванаў згубіў класавую пільнасць, не заўважыў таго, што рабілі шкоднікі ў яго на вачах. Толькі палітычная блізарукасць кіраўніцтва Белільнатрактарацэнтра дала магчымасць класава-варожым шкоднікам элементам распераздаць і весці сваю падрыўную работу.

Брыгада «Звязды»:
Я. БЕЛКІН, С. ГАЛКІН.

ЗАЗЯБЛЕНА УСЯГО 43,4 ПРОЦ.

ХОД ЗЯБЛІВА ПА БССР НА 25 КАСТРЫЧНІКА

УСЯГО	САЎГАСЫ	КАЛГАСЫ	АДНААСОБНІКІ
43,4	66,2	39,5	49,5

ГАНЕБНА ЗРЫВАЮЦЬ ЗЯБЛІВА

РАСОНЫ
УШАЧЫ
БЕШАНКОВІЧЫ
ЧАШНІКІ
ЛЁЗНА
ЧЫРВОНАПОЛЛЕ

ГЭТЫЯ РАЁНЫ ЗАЗЯБЛІЛІ МЕНШ 20-ці ПРОЦ. ВЫЗНАЧАНАЙ ПЛОШЧЫ

ЧАМУ РЭЧЫЦА НА 70 МЕСЦЫ?

РЭЧЫЦА.

Рэчыцкі раён увесь час адстае ў адгрузцы бульбы. Да 26-та кастрычніка план адгрузкі Ленінграду выкананы на 75,7 проц. Ганебна адстае раён і ў **абавязковых пастаўках.** Ён зай мае 70-е месца ў спісе раёнаў БССР. На 25 кастрычніка загатоўлена толькі 50,6 проц. гадавога плана.

Мясцовыя арганізацыі зусім не ўлічылі новых абставін загатовак, не ўлічылі, што абавязковыя пастаўкі бульбы маюць сілу падатка. Яны не скарысталі ўсіх сродкаў, каб дабіцца своячасовага выканання плана.

У Рэчыцы паўтараюць апідныя памылкі мінулага года, калі загатоўкі зацягнуліся да сярэдзіны зімы, калі мясцовыя арганізацыі мінальнічалі з сабатажнікамі.

Вясцовая грамадскасць не мабілізавана на дагарміновае выкананне дзяржаўнага задання. Больш таго, рэчыцкія арганізацыі сваёй бяздзейнасцю фактычна патураюць сабатажу паставак.

Звернемся да фактаў. Вось калгас **«Хі Кастрычнік»,** Кабылеўскага сельсавета. Ён выканаў менш каловы задання. Старшыня праўлення **ДУБАВІК** патурае лодырам і прагулыгчыкам. Працыцыплінна ў запізнадзе, меры да лодыраў не прымаюцца. Дубавік праводзіць на справе кулацкую палітыку. Ён дапамагае варожым элементам, якія распальваюць дробна-буржуазныя тэндэнцыі. Ён заявляе: «Калгаснікі выкананюць раней сваю бульбу, а потым возьмуцца за калгасную. Да марозаў яшчэ далёка».

Калгас **імя Молатава,** Падалескага сельсавета, здаў дзяржаве каля 40 проц. бульбы паводле задання. Большасць калгаснікаў занята ўборкай сваіх гародаў, якія ў многіх гаспадарках дасягаюць аднаго га; яны таксама сеюць зараз пшаніцу і жыта на прысядзібных участках.

У калгасе **«Гігант»** старшыня **ЯШЧЫН** замест арганізацыі працы на ўборцы запіўся падпушчанем рабочых для ўборкі бульбы на сваёй сядзібе. Гэтым-жа занят загадчык гаспадаркі **КУЛІК.** Іх прыкладу следуюць іншыя калгаснікі. Яны ўбіраюць буль бу на сваіх гародах і не выходзяць на работу на калгасныя палі. У выніку зрываецца здача прадукцыі дзяржаве, шмат бульбы застаецца нявыбранай.

У калгасе **«Парастак соцыялізма»** выходзяць на ўборку не раней 10 гадзін. Старшыня **КАДОЎБА** не прыняў зусім ніякіх мер, каб падняць працоўную дысцыпліну. Ён угарта супраціўляўся арганізацыі грамадскага харчавання на полі.

Не гледзячы на рад сігналаў «Рэчыцкай праўды» аб тым, што ва многіх калгасах разбухлі прысядзібныя ўчасткі, што гэта з'яўляецца адной з прычын дрэннага выканання плана с.-г. работ, райком, РВК і райзадгэтуль не прынялі ніякіх мер.

Яшчэ горш стаіць справа на аднаасобным сектары. У Бязуеўскім сельсавеце кулацка-заможныя гаспадаркі зусім не выконваюць сваіх абавязацельстваў. У Сямёнаўскім сельсавеце план здачы бульбы выкананы на 30 проц. Старшыня сельсавета **ФІДЭЛЬ** зрэсся з кулацтвам і нічога не зрабіў, каб зламаць сабатаж паставак—дагэтуль ніхто не прыцягнут да адказнасці.

У пасёлку Іванічы, **Заспенскага** сельсавета, кулацкія элементы арганізавалі яўны сабатаж паставак, а старшыня **АНІКЕЕЎ** і ўпаўнаважаны РК **ГОЛЬДБЕРГ** глядзяць на гэта скрозь пальцы.

Васілевіцкі сельсавет выканаў план паставак на аднаасобнаму сектару на 12,8 проц. Упаўнаважаныя РК і члены сельсавета **Брэль, Гарывацкі, Маслакаў,** прымацаваныя да паасобных участкаў, правялі тут злачынную бяздзейнасць. Гніла-ліберальныя адносіны да сабатажнікаў прывялі да зрыва паставак на сельсавеце.

РК і РВК паслалі ў сельсавет сваіх упаўнаважаных. Але запісаўшы ў пратакол пастанову аб насыпцы людзей, кіраўнікі раёна зараз-жа забылі аб гэтым. Большасць упаўнаважаных, або самавольна пакінулі вёскі, або адседжваюцца ў сельсаветах і, літаральна, нічога не робяць па пастаўках. А пад іх крылом акапаўся сабатажнік.

Неадкладная задача рочыцкіх кіруючых арганізацый — паладзіць канкрэтнае кіраўніцтва пастаўкамі, зламаць гніла-ліберальныя адносіны да зрыўшчыкаў здачы прадукцыі дзяржаве.

ЧІКІФАРАЎ.

РЫХТУЙЦЕ ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ XVI КАСТРЫЧНІКУ

ЖЛОБІН

Жлобінскі раён поўнасцю скончыў цэнтралізаваны загатоўкі гародніны. Прыступлена да выканання плана дэцэнтралізаваных загатовак.

Пленум райкома пастанавіў адгрузіць звыш плана маршрут з гародніной Ленінграду да кастрычніцкіх свят.

БАБРУЙСК

Задание партыі і ўрада на адгрузцы бульбы і гародніны выканана. Адгружулена 8.650 тон бульбы пры заданні 8.575, 802 тоны капусты пры заданні 800, 500 тон кораплодаў — 100 проц. плана і 10 — цыбулі — таксама 100 проц.

БЕШАНКОВІЧЫ

Дадатковы нарад Ленінграду ў 600 тон бульбы і 75 гародніны выкананы.

Макавееў.

ЛЮБАНЬ

Партыйна-совецкія арганізацыі раёна дабіліся поўнага выканання плана зяблевага ворыва па аднаасобным сектары. Пры плане 3.500 га заазяблена 3.529.

(БЕЛТА).

РАСОНЫ

Калгас **«ЧЫРВОНАЯ ПЕРАМОГА»** занесен на раённую чырвоную дошку. І зусім заслужана: калгас поўнасцю выканаў гадавы план збораж-паставак, уключаючы і натураплату за работу МТС. План здачы ільнасемя таксама выкананы на 100 проц.

Зараз у калгасе па-базавому разгорнута зяблева і апрацоўка ільну. Калгаснікі ўсімі сіламі змагаюцца за тое, каб скончыць гэту работу не пазней 5 лістапада, з тым, каб забяспечыць права на ўдзел у кастрычніцкіх святах у Менску.

ТАМ, ДЗЕ ПРЫТУПІЛАСЯ РЭВОЛЮЦЫЙНАЯ ПІЛЬНАСЦЬ

1929—30 гады былі якраз тым перыядам, калі КП(б)Б выкрыла і разграміла контр-рэвалюцыйных нацдэмаў, ака пашыхся ў гаспедарчых, культурных і навуковых цэнтрах БССР. Іменна ў гэты перыяд—у ліпені 1930 года—партыя накіравала т. Бялугу на адказную кіруючую работу ў Наркамасветы. Перад новым кіраўніцтвам Наркамасветы стаяла задача — ў найкарацейшы тэрмін ліквідаваць спадчыну нацдэмаўшчыны па ўсіх участках фронта нацыянальна-культурнага будаўніцтва, ачысціць апарат органаў асветы зверху да нізу ад нацдэмаўскага элемэнта, разгарнуць большэвіцкую непрымірымую барацьбу за правільнаеажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Тав. Бялуга сваю дзейнасць пачынае в таго, што насяляючы жыць у свайго стрыечнага брата **Бялугі Мікалая**—былога віцэ-прэзідэнта Акадэміі Навук—**ближэйшага паплечніка аднаго з підэраў беларускіх нацдэмаў—Ігнатоўскага.** Намеснік наркома не дапамагае партыі выкрыць твар свайго сваяка з нацдэмаўскага лагера.

Замест таго, каб з першых-жа дзён работы ў Наркамасветы пачаць барацьбу за ачышчэнне апарата апошняга ад крыгаўшчынскага нацдэмаўскага элемэнта, Бялуга і Платун пачынаюць высоўваць нацдэмаўца **Валіцкага, Сцяпуру і Звенчыка.** Нашчэт Сцяпура з інспектарату ўсеагульнага навучання высоўваецца ў Закладзкі планава-статыстычны сектарам. Справа даходзіць да таго, што **пры скарачэнні штатаў** з гэтага сектара **звальняюць комуніста, а Сцяпуру пакідаюць, як «незаменнага»** работніка. Больш таго, а Сцяпура і Звенчык пад пагрозай Бялугі высоўваюцца як лепшыя ўдарнікі, прэмійаваныя за «звышударную» работу, ставяцца ў прыклад усяму апарату і ў першую чаргу—комуністам работнікам наркомата. Карыстаючыся прытуленнем класавай пільнасці і бліжэйшым давер'ем кіраўніцтва, Наркамасветы, нацдэм Сцяпура працядзе справу Валіцкіх, Некрашэвіча, Лёжкаў і К°, наўхільна праводзячы лінію на ігнараванне інтарэсаў працоўных рускай нацыянальнай меншасці. Жаншчоры то матэрыялаці ўсесаюзнага дэмаграфічнага перапіса 1926 года, то «спэцыяльным» школьным абследаннем, тэты прытаўшыся нацдэм запэўнае кіраўніцтва Наркамасветы, што дзеці рускага насельніцтва Беларусі заніжаючаць месцамі ў рускіх школах на... 145 проц. у гарадах, а ў сельскіх мясцовасцях, моў, насельніцтва гэтай нацыянальнасці не жыве компактна і школ, выходзіць, не трэба.

Вінна за прарыў у гэтай галіне нацыянальнага будаўніцтва ў першую чаргу ляжыць на Бялугу,—ён як нам, наркома адказваў за планава-статыстычны сектар. Будучы першым намеснікам наркома Платуна, т. Бялуга не толькі не прыняў мер да ліквідацыі спадчыны нацдэмаўшчыны ў справе ігнаравання інтарэсаў рускай нацыянальнай меншасці, але наогул не займаўся гэтым пытаннем і прадставіў тут поўную свабоду для ніксдзіцкай дзейнасці нацдэмакрата Сцяпуры. Сакавіцкія пасановы ЦК КП(б)Б па Нарпамасвеце і сур'ёзнае папярэджанне Бялугу—не былі апошнім па-большэвіцку ўказаннем. На чыстцы тав. Бялуга прымушаны быў прызнацца, што гэтага пытання ён не ставіў, правільней кажучы, працігваў яго ігнараваць. У рэзультаце спаўчына нацдэмаўшчыны яшчэ не ліквідавана і, напрыклад, у раёнах былой Калінінскай акругі да гэтага часу няма ніводнай рускай школы. У раёнах былой Полацкай акругі, у якой паводле даных дэмаграфічнага перапіса 1926 года налічвалася 14.791 чал. рускай нацыянальнасці, а руская мова з'яўлялася роднай больш чым у 47 тыс. чал., ны маем усяго толькі чатыры рускія школы агульнага кшталту. У рэзультаце палітыкі Сцяпуры мы яшчэ ў мінулым навучальным годзе не мелі замаль ні адной рускай ШКМ у сельскіх мясцовасцях. Незадоўга, у яным станоўчыны справа і ў гэтым навучальным годзе, бо даных аб росце сеткі рускіх школ у Наркамасвеце няма. Больш таго, на калегіі Наркамасветы, ужо пасля сакавіцкай пастановы ЦК не раз ставілася пытанне «аб росце рускіх школ», але ўвесь час змазывалася і нарэшце 26-га ліпеня калегія запазычала, «у асноўным» праект пастановы па гэтым пытанні, даручыўшы апачаткова т. т. Улазеву і Кон'ю, трошку больш удакладніць яго на нарадзе загалчыкаў раёнаў. Мы не будзем гаварыць ужо аб аналітычнасці гэтага праекта, у якім не дасцца ніякага палітычнага аналіза стану сеткі рускіх школ, мы ўкажам толькі на тое, што гэты праект за гэтага часу не толькі не ўбачыў свэта, але застаўся неўдакладненым і неўрэгулёным. Не спаўна мы ў Наркамасвеце і дырэктыў мясцам на дачым пытанні.

На пытанне старшыні праверкома тав. Вазіфеўскага—як тав. Бялуга змагаўся за ачышчэнне апарата Наркамасветы і яго ўстаноў ад класава-варожых нацыяналістычных элементаў, сход пачуў адказ:

«Мне здавалася, што засмечанасці няма ні ў Наркамасвеце, ні на месцах»...

Гэты адказ больш чым ярка характарызуе, наколькі Бялуга ўразумеў пастановы ЦК КП(б)Б аб скажэннях нацыянальнай палітыкі партыі і аб Наркамасветы, гэту адказ гаворыць або аб поўнай страце ім рэвалюцыйнай пільнасці, або яшчэ аб горшым. У святле гэтага адказа будзе больш чым зразумелым тое, што на чыстцы т. Бялугі мы ўсё ж ад яго не чулі сло ва нацдэм, яно вельмі далікатна ім абыходзілася. Не спадчынай нацдэмаўшчыны, а толькі недаацэнкай інтарэсаў рускай нацыянальнай меншасці—ацэнкай Бялуга лінію на скарачэнне сеткі рускіх школ, Сцяпура па яго не нацдэм, а толькі стары чыноўнік. Працуючы ў 1929 годзе па адказнай рабоце ў Койданаўскім райкоме партыі тав. Бялуга таксама не заўважыў контрэвалюцыйнай дзейнасці нацдэмаўскай групы ў Койданаўскай ПШКМ. У гэтай школе ў той час адкрыта прапавядалася нацдэмаўскага аховіна, Бялуга і Платун пачынаюць высоўваць нацдэмаўца **Сцяпуру і Звенчыка.** Нашчэт Сцяпура з інспектарату ўсеагульнага навучання высоўваецца ў Закладзкі планава-статыстычны сектарам. Справа даходзіць да таго, што **пры скарачэнні штатаў** з гэтага сектара **звальняюць комуніста, а Сцяпуру пакідаюць, як «незаменнага»** работніка. Больш таго, а Сцяпура і Звенчык пад пагрозай Бялугі высоўваюцца як лепшыя ўдарнікі, прэмійаваныя за «звышударную» работу, ставяцца ў прыклад усяму апарату і ў першую чаргу—комуністам работнікам наркомата. Карыстаючыся прытуленнем класавай пільнасці і бліжэйшым давер'ем кіраўніцтва, Наркамасветы, нацдэм Сцяпура працядзе справу Валіцкіх, Некрашэвіча, Лёжкаў і К°, наўхільна праводзячы лінію на ігнараванне інтарэсаў працоўных рускай нацыянальнай меншасці. Жаншчоры то матэрыялаці ўсесаюзнага дэмаграфічнага перапіса 1926 года, то «спэцыяльным» школьным абследаннем, тэты прытаўшыся нацдэм запэўнае кіраўніцтва Наркамасветы, што дзеці рускага насельніцтва Беларусі заніжаючаць месцамі ў рускіх школах на... 145 проц. у гарадах, а ў сельскіх мясцовасцях, моў, насельніцтва гэтай нацыянальнасці не жыве компактна і школ, выходзіць, не трэба.

Вінна за прарыў у гэтай галіне нацыянальнага будаўніцтва ў першую чаргу ляжыць на Бялугу,—ён як нам, наркома адказваў за планава-статыстычны сектар. Будучы першым намеснікам наркома Платуна, т. Бялуга не толькі не прыняў мер да ліквідацыі спадчыны нацдэмаўшчыны ў справе ігнаравання інтарэсаў рускай нацыянальнай меншасці, але наогул не займаўся гэтым пытаннем і прадставіў тут поўную свабоду для ніксдзіцкай дзейнасці нацдэмакрата Сцяпуры. Сакавіцкія пасановы ЦК КП(б)Б па Нарпамасвеце і сур'ёзнае папярэджанне Бялугу—не былі апошнім па-большэвіцку ўказаннем. На чыстцы тав. Бялуга прымушаны быў прызнацца, што гэтага пытання ён не ставіў, правільней кажучы, працігваў яго ігнараваць. У рэзультаце спаўчына нацдэмаўшчыны яшчэ не ліквідавана і, напрыклад, у раёнах былой Калінінскай акругі да гэтага часу няма ніводнай рускай школы. У раёнах былой Полацкай акругі, у якой паводле даных дэмаграфічнага перапіса 1926 года налічвалася 14.791 чал. рускай нацыянальнасці, а руская мова з'яўлялася роднай больш чым у 47 тыс. чал., ны маем усяго толькі чатыры рускія школы агульнага кшталту. У рэзультаце палітыкі Сцяпуры мы яшчэ ў мінулым навучальным годзе не мелі замаль ні адной рускай ШКМ у сельскіх мясцовасцях. Незадоўга, у яным станоўчыны справа і ў гэтым навучальным годзе, бо даных аб росце сеткі рускіх школ у Наркамасвеце няма. Больш таго, на калегіі Наркамасветы, ужо пасля сакавіцкай пастановы ЦК не раз ставілася пытанне «аб росце рускіх школ», але ўвесь час змазывалася і нарэшце 26-га ліпеня калегія запазычала, «у асноўным» праект пастановы па гэтым пытанні, даручыўшы апачаткова т. т. Улазеву і Кон'ю трошку больш удакладніць яго на нарадзе загалчыкаў раёнаў. Мы не будзем гаварыць ужо аб аналітычнасці гэтага праекта, у якім не дасцца ніякага палітычнага аналіза стану сеткі рускіх школ, мы ўкажам толькі на тое, што гэты праект за гэтага часу не толькі не ўбачыў свэта, але застаўся неўдакладненым і неўрэгулёным. Не спаўна мы ў Наркамасвеце і дырэктыў мясцам на дачым пытанні.

На пытанне старшыні праверкома тав. Вазіфеўскага—як тав. Бялуга змагаўся за ачышчэнне апарата Наркамасветы і яго ўстаноў ад класава-варожых нацыяналістычных элементаў, сход пачуў адказ:

«Мне здавалася, што засмечанасці

Гэты адказ больш чым ярка характарызуе, наколькі Бялуга ўразумеў пастановы ЦК КП(б)Б аб скажэннях нацыянальнай палітыкі партыі і аб Наркамасветы, гэту адказ гаворыць або аб поўнай страце ім рэвалюцыйнай пільнасці, або яшчэ аб горшым. У святле гэтага адказа будзе больш чым зразумелым тое, што на чыстцы т. Бялугі мы ўсё ж ад яго не чулі сло ва нацдэм, яно вельмі далікатна ім абыходзілася. Не спадчынай нацдэмаўшчыны, а толькі недаацэнкай інтарэсаў рускай нацыянальнай меншасці—ацэнкай Бялуга лінію на скарачэнне сеткі рускіх школ, Сцяпура па яго не нацдэм, а толькі стары чыноўнік. Працуючы ў 1929 годзе па адказнай рабоце ў Койданаўскім райкоме партыі тав. Бялуга таксама не заўважыў контрэвалюцыйнай дзейнасці нацдэмаўскай групы ў Койданаўскай ПШКМ. У гэтай школе ў той час адкрыта прапавядалася нацдэмаўскага аховіна, Бялуга і Платун пачынаюць высоўваць нацдэмаўца **Сцяпуру і Звенчыка.** Нашчэт Сцяпура з інспектарату ўсеагульнага навучання высоўваецца ў Закладзкі планава-статыстычны сектарам. Справа даходзіць да таго, што **пры скарачэнні штатаў** з гэтага сектара **звальняюць комуніста, а Сцяпуру пакідаюць, як «незаменнага»** работніка. Больш таго, а Сцяпура і Звенчык пад пагрозай Бялугі высоўваюцца як лепшыя ўдарнікі, прэмійаваныя за «звышударную» работу, ставяцца ў прыклад усяму апарату і ў першую чаргу—комуністам работнікам наркомата. Карыстаючыся прытуленнем класавай пільнасці і бліжэйшым давер'ем кіраўніцтва, Наркамасветы, нацдэм Сцяпура працядзе справу Валіцкіх, Некрашэвіча, Лёжкаў і К°, наўхільна праводзячы лінію на ігнараванне інтарэсаў працоўных рускай нацыянальнай меншасці. Жаншчоры то матэрыялаці ўсесаюзнага дэмаграфічнага перапіса 1926 года, то «спэцыяльным» школьным абследаннем, тэты прытаўшыся нацдэм запэўнае кіраўніцтва Наркамасветы, што дзеці рускага насельніцтва Беларусі заніжаючаць месцамі ў рускіх школах на... 145 проц. у гарадах, а ў сельскіх мясцовасцях, моў, насельніцтва гэтай нацыянальнасці не жыве компактна і школ, выходзіць, не трэба.

Вінна за прарыў у гэтай галіне нацыянальнага будаўніцтва ў першую чаргу ляжыць на Бялугу,—ён як нам, наркома адказваў за планава-статыстычны сектар. Будучы першым намеснікам наркома Платуна, т. Бялуга не толькі не прыняў мер да ліквідацыі спадчыны нацдэмаўшчыны ў справе ігнаравання інтарэсаў рускай нацыянальнай меншасці, але наогул не займаўся гэтым пытаннем і прадставіў тут поўную свабоду для ніксдзіцкай дзейнасці нацдэмакрата Сцяпуры. Сакавіцкія пасановы ЦК КП(б)Б па Нарпамасвеце і сур'ёзнае папярэджанне Бялугу—не былі апошнім па-большэвіцку ўказаннем. На чыстцы тав. Бялуга прымушаны быў прызнацца, што гэтага пытання ён не ставіў, правільней кажучы, працігваў яго ігнараваць. У рэзультаце спаўчына нацдэмаўшчыны яшчэ не ліквідавана і, напрыклад, у раёнах былой Калінінскай акругі да гэтага часу няма ніводнай рускай школы. У раёнах былой Полацкай акругі, у якой паводле даных дэмаграфічнага перапіса 1926 года налічвалася 14.791 чал. рускай нацыянальнасці, а руская мова з'яўлялася роднай больш чым у 47 тыс. чал., ны маем усяго толькі чатыры рускія школы агульнага кшталту. У рэзультаце палітыкі Сцяпуры мы яшчэ ў мінулым навучальным годзе не мелі замаль ні адной рускай ШКМ у сельскіх мясцовасцях. Незадоўга, у яным станоўчыны справа і ў гэтым навучальным годзе, бо даных аб росце сеткі рускіх школ у Наркамасвеце няма. Больш таго, на калегіі Наркамасветы, ужо пасля сакавіцкай пастановы ЦК не раз ставілася пытанне «аб росце рускіх школ», але ўвесь час змазывалася і нарэшце 26-га ліпеня калегія запазычала, «у асноўным» праект пастановы па гэтым пытанні, даручыўшы апачаткова т. т. Улазеву і Кон'ю трошку больш удакладніць яго на нарадзе загалчыкаў раёнаў. Мы не будзем гаварыць ужо аб аналітычнасці гэтага праекта, у якім не дасцца ніякага палітычнага аналіза стану сеткі рускіх школ, мы ўкажам толькі на тое, што гэты праект за гэтага часу не толькі не ўбачыў свэта, але застаўся неўдакладненым і неўрэгулёным. Не спаўна мы ў Наркамасвеце і дырэктыў мясцам на дачым пытанні.

На пытанне старшыні праверкома тав. Вазіфеўскага—як тав. Бялуга змагаўся за ачышчэнне апарата Наркамасветы і яго ўстаноў ад класава-варожых нацыяналістычных элементаў, сход пачуў адказ:

«Мне здавалася, што засмечанасці

6-га лістапада—фініш пераклічкі

ЯШЧЭ МАЦНЕЙ ЗМАГАЦЦА ЗА КОЛЬКАСНЫЯ І ЯКАСНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ

МАЛАДОМУ РАБОЧАМУ—ШЭФА КАДРАВІКА

Металісты менскага чыгуна-ліцейнага і машынабудаўнічага завода **«Комунар»** набліжаюцца да сустрэчы гістарычнага Кастрычніка са значнымі дасягненнямі.

Прамфінплан па валавой прадукцыі выкананы за дзевяць месяцаў гэтага года на **115 проц.** Падрэнна стаіць справа і з якаснымі паказальнікамі. Прадукцыйнасць працы ўзнялася на **119,3** проц., сабекошт прадукцыі знізіўся на **9,2** проц.

Завод даў у фонд сацыялістычнага накаплення толькі за дзевяць месяцаў звыш **45** тысяч рублёў.

Набліжэнне ўсебеларускага злёта ўдарнікаў якасці і XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі яшчэ больш узняло творчую ініцыятыву рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў завода.

Зараз на заводзе абвешчан конкурс на лепшы цэх, брыгаду і паасобных ударнікаў у выкананні прамфінплана па ўсіх яго паказальніках. Конкурс у значнай ступені актывізаваў сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва.

У спаборніцтве прымаюць удзел не толькі рабочыя, а і інжынерна-тэхнічныя работнікі.

На закліч майстроў машынабудаўнічых заводаў Саюза аб разгортванні сацспаборніцтва сярод інжынерна-тэхнічных работнікаў майстар механічнага цэха тав. **Татаржыцкі** і кавальскага цэха тав. **Лазавін** першымі з майстроў беларускіх машынабудаўнічых заводаў уключыліся ва ўсесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва.

На заводзе адбылася масава-вытворчая работа, якая значна дапамагае выкананню прамфінплана. Яе цэнтр перанесен галоўным чынам у цэхі, брыгады. За апошні час пачалі сістаматычна праводзіцца вытворчыя нарады па больш актуальных пытаннях вытворчасці: якасці прадукцыі, пытаннях сацыялістычнай рацыяналізацыі. Вынікам гэтага можна лічыць тое, што паасобныя рабочыя і нават цэлыя брыгады (цэсочнікі, залёўшчыкі) здолелі амаль поўнасцю ліквідаваць брак у сваёй рабоце.

На заводзе масава-вытворчая работа ўвяляецца з аўладаннем тэхнікай вытворчасці.—**Не можа быць высокай прадукцыйнасці працы і добраякаснай прадукцыі без канкрэтных, глыбокіх ведаў працэса вытворчасці, варштатаў — пад такім лозунгам разгортваецца тэхнічная вучоба на заводзе.**

Зараз працуюць дзесяць гурткоў па аўладанню тэхмінімумам. Імі ахоплена каля 150 рабочых. У тэхнічную вучобу ўцягнуты ў якасці кіраўнікоў інжынерна-тэхнічныя работнікі, якія за апошні час паладзілі ў механічным цэху тэхнічную кансультацыю для рабочых найбольш нізкай кваліфікацыі. Для падрыхтоўкі камандзіраў сярэдняга тэхнічнага звяна, павышэння кваліфікацыі, больш паглыбленага вывучэння тэхналагічнага працэса на заводзе арганізаваны шасці і дзесяці-месячныя курсы, на якіх навучаецца звыш **40** токараў, слесараў і інш. Па скончэнні тэхкурсаў многія рабочыя павінны будуць заняць пасады майстроў.

Зараз комупараўцы арганізавалі тэхнічны гурток па вывучэнню тэхнікі баспечнасці. У гэтым гуртку, апрача рабочых, прымаюць удзел каля дваццаці брыгадзіраў і майстроў.

Усе гэтыя формы тэхнічнай вучобы, праграмы гурткоў падпрадкаваны асноўнай мэце: хутчэй аўладаць тэхнікай сваёй вытворчасці, вывучыць дасканала свой варштат, ведаць яго матэры, каб сапраўды даваць совецкай краіне машыны лепшай якасці.

Старыя рабочыя, з багацейшым вытворчым вопытам завода, хутка падхапілі кантроўны пачын перадавікоў сацыялістычнай індустрыі — шэфства над маладымі, малакваліфікаванымі рабочымі.

Вось стары рабочы, кваліфікаваны фрэзероўшчык тав. **Дубавіцкі**, які мае 30 год вытворчага стажа, узяў індыўідуальнае шэфства над маладымі рабочымі **Гукам і Малішэўскім.** Такі-ж прыклад паказаў і высокакваліфікаваны токар тав. **Лапін**, маючы каля 37 год вытворчага стажа, які ўзяў шэфства над рабочым тав. Цыкіным.

Перадаць багаты вытворчы вопыт сваім падшэфным, хутчэй зрабіць з іх кваліфікаваных ударнікаў, каб яшчэ больш узняць прадукцыйнасць працы і палепшыць якасць прадукцыі — вось наша задача, — кажуць шэфы Дубавіцкі, Лапін і іншыя, падобныя да іх.

У недалёкім часе ўступае ў строй новы механазборачны цэх завода, які з'яўляецца буйнейшым цэхам металазаводаў БССР.

Гэта яшчэ больш натхніе рабочы калектыў завода.

Не здаваць, а яшчэ больш узмацніць тэмпы работы, каб з поспехам выканаць прамфінплан першага года другой пяцігодкі — такі абавязак комупараўцаў.

П. В.

ЛЕСАКАМБІНАТ РЫХТУЕЦЦА ДА КАСТРЫЧНІКА

БАБРУЙСК .(Наш кар).

Дабіцца 100 проц. выканання прамфінплана—шэф такім лозунгам разгортваецца падрыхтоўка лесакамбіната да вялікага свята сусветнага пролетарыята—XVI гадавіны Кастрычніка. Канкрэтна гэта азначае, што лесацэх № 1 павінен даць да свята **19617** кум. пілапрадукцыі, база сырца павінна выкаціць на бераг **160.000** кум. леса, стандартны цэх — выпусціць 1500 кум. пакетаў (спец. вагонны завод), а біржа піламатэрыялаў абавязана адгрузіць 460 вагонаў лесаэкспарта.

Кожны адзін процант камбінатскага прамфінплана дае на **240.000** рублёў патрэбнай краіне прадукцыі.

Як-жа лесакамбінатаўцы выпраўляюць пастаўленую перад імі задачу? Патрэбна адзначыць, што сігналы «Звязды» ўзварушылі арганізацыі і ўвесь работны калектыў камбіната.

Зроблен буйны крок наперад па адгарадзенню транспарта. Адрамантаваны з лесазавозы, пушчаны ў работу з трактары-чапалы. Гэтымі днямі прыбывае яшчэ 5 цягачоў. Менш стала заваліў па цэхах, менш прастояў. Рамонт лесацэх прастойваў кожны дзень па 25 проц. рабочага часу, зараз прастоі бываюць рэдка, а калі і бываюць, дык не больш 10-15 мінут. Калі прыбудуць цягачы, і гэта будзе ліквідавана.

Для перавозкі далёка жывучых рабочых курсіруюць 2 аўтобусы. Праведзен агляд ударніцтва. Выяўлена больш 200 ілжэ-ударнікаў, якія зрывалі работу на выкананні прамфінплана. Зараз у сувязі з пераадкастрычніцкай ударнікай рады ўдарнікаў атрымліваюць новае пашпарэнне.

Стандартцэх асвоіў новы тэхналагічны працэс—выпуск спецыяльных пакетаў. Бестрэўцэх, які доўга бяздзейнічаў, зараз з поўнай нагрузкай працуе на выпуску новага тыпу дзвярэй. Значна ўнімаюцца тэмпы выканання прамфінплана.

Лесацэх № 2 за першую пяцідзеўку кастрычніка свой план выканаў на 101 проц., за дэкаду—102 проц., за 15 дзён —100,5 проц. Бестрэўцэх на выкананню плана ўзняўся з 65 проц. да 99 проц. і выпуск экспарта—з 76 проц. да 95 проц.

Замацаваць дасягнутае і паскорыць тэмпы—неадкладная задача лесакамбінатаўцаў.

ЧЫКУН.

ЗА СПІНОЙ ШЧЫТА

Голас аўтаматчыка злы, усхваляваны і рэзкі пагрываецца ўладарным гулам машын і даходзіць прыдушаным, слабым. Аўтаматчык зараз ядзе і та ластуся: да аўтамата не падалі салоўкі. Аўтамат ад пачатку змены пратрацаваў яких [illegible] паўгадзіны і павінен стаць. І [illegible] утаіў перапрыхільную злабу [illegible]гаматчыка, але праз некалькі мінут грукат рытмічна ператвараецца. У цэху паступае незвычайная, трывожная цішыня і ў гэтай цішыні выразна і ясна гучыць голас:

— Зноў загадзеце пісаць простой, каб вас чорт...

У нечаканай цішыні кожны рабочы адчувае папрэк, які гучыць неабверженым абвінавачаннем у няўмелай працаваць. І хочацца ў гэтым маўклівым высокім цэху спытацца: «Дзе вінаваты маўчанні?»

Так вымушанае маўчанне машын падкопвае план, гальбіць прарывам совецкае прадпрыемства.

Так паводзіцца простой.

У лёку многіх фабрык і заводаў БССР у пераадкастрычніцкую пераклічку ўключылася і **«Пролетарская перамога».** Ля фабрычных варот выстаўлена некалькі фанерных шчытоў з лозунгамі, дэкларуючымі ўступленне фабрыкі ў пераклічку. Але за фабрычнай агарожай, за спіной гэтых шчытоў пануе пацяздзяючых спраў. Над святочнай шумнай спрэчаецца дзіўнае бяздушша да аднаго з асноўных лозунгаў пераклічкі.

Гутарка ідзе аб асвоеньні тэхнікі, гутарка ідзе аб незкончых прастоях. Але перш чым сказаць аб гэтым, трэба раскрыць вочы на тое, што супакойвае завіс фабрыку і выклікае благадушны запытаньне ў кіраўнікоў: «У нас не так ужо кепска».

Паглядзім на заводку «Пролетарскай перамогі». Мы пабачым супакойваючыя трохзначныя лічбы. За дзевяць месяцаў план на выпуску валавой прадукцыі выкананы на 102,3 проц. У верасні фабрыка выканала яго на 124,8 проц., а за дзве дэкады кастрычніка—на 94 проц.

Лічбы гэтыя фігуруюць на ўсіх афіцыяльных справаздачах фабрыкі. На гэтай падставе ў Барысаве **«Пролетарскую перамогу»** лічаць вядучай. Гэта дае магчымасць кіраўнікам фабрыкі сям-там казыраць гэтымі днямі...

На сходзе «Пролетарская перамога» не выканала плана.

Фабрыка не падтасоўвала лічбы. «Пролетарская перамога» сапраўды дала больш значэлак. Але калі глыбока прааналізаваць работу фабрыкі, то мы ўбачым вельмі характарнае для многіх прадпрыемстваў з'явішча.

«Пролетарская перамога» працавала больш часу, чым прадугледжана планам. Фабрыка «штурмавала» за кошт выходных дзён, за кошт звышчасовых работ. Абсягнуўшы паказальнік—сярэдняя дзённая выпрацоўка на 1 рабочага—выкрывае работу фабрыкі. Сярэдняя дзённая выпрацоўка раскрывае ісціну. Гэту лічбу не падтасуеш. Гэты паказальнік прадукцыйнасці фабрыкі ўсёт з таго-ж плана.

Такім чынам, за 8 месяцаў вытворчая праграма ў дзень — **2.508** скрынак — выканана толькі на **2.350** скрынак. Фабрыка значыць, не дадае 58 з лішнім скрынак. Памножым гэтыя 58 скрынак на восем месяцаў і атрымаем больш 12 тысяч.

Асноўныя вагары фабрыкі—аўтаматы «Ідэал»—прасталі за дзевяць месяцаў **2.910** гадзін. Трэба было заставаць гэты прарыў і люцзі зашывалі «штурмамі», звышчасовымі работамі.

Але за прарыстай абалонкай «штурмаў» не ўтаіць **2.910** фастрачных рабочых гадзін.

Аўтаматы—«соўны цэх запаважай фабрыкі. Астатнія пэхі не менш важныя, але ўсё-ж іх задача зводзіцца да запрацоўкі, падрыхтоўкі і ўпакоўкі запалак. Зрабіць, таму, аналіз работы аўтаматаў—значыць аналізаваць работу ўсяго прадпрыемства.

Спачатку аб «аўтаматах.

«Пролетарская перамога» працуе на аўтаматах «Ідэал». Каталожная магутнасць аўтамата (быстраходнага)—26,6 скрынкі ў гадзіну пры 90 зваротах. Ціхаходны аўтамат дае 23,4 скрынкі ў гадзіну пры 86 зваротах.

Каталожная магутнасць аўтамата—гэта тая колькасць прадукцыі, якую можа даць машына, працуючы без перапынка і астановак. Планавая магутнасць — гэта фактычная колькасць прадукцыі, якую павінен даць аўтамат, калі адкінуць так званыя паўхільныя прастоі.

«Пролетарская перамога» ўстанаўляе «паўхільныя» прастоі з сярэдняй колькасці прастояў у рабоце фабрыкі за пачаткавыя некалькі год. Адсюль зусім зразумела, наколькі правільны гэтыя «паўхільныя» страты. Але дапусцім, што план завёрстан правільна. Дапусцім, што гэта колькасць страт законная.

Калі адкінуць гэтыя паўхільныя страты (на зарадку, уборку—10 мінут, на тэхнічна-неабходныя ўрэгуляванні і чыстку лафета—10 мінут, на мойку стала два разы ў змену—15 мінут), то мы атрымаем планавую магутнасць аўтаматаў «Пролетарскай перамогі».

Што-ж паказвае практыка?

На практыцы аўтаматы замест планавых 20,6 скрынкі ў гадзіну (сярэдняя абсягных скарасцей) даюць толькі 20 скрынак. Так фабрыка працавала на працягу дзевяці месяцаў. Колькі аўтамат на працягу сазоны не дадае 0,6 скрынкі, а за дзевяць месяцаў гэта будзе ўжо салідная лічба, якая ў стварыла прабоину ў плане «Пролетарскай перамогі».

Аўтамат адказвае за шкіх толькі ў тым выпадку, калі правільна арганізован планава-пэнераджальны рамонт, калі да яго бярэжліва адносіцца, своячасова змазваць, своячасова знішчаць затрымкі.

Аднак, аўтаматы «Пролетарскай перамогі» працуюць з перабоямі, яны перадаюць сваёй планавай магутнасці на 10,5 проц.

Разгледзім прычыны гэтых прастояў і перад намі ўсныве рад новых цікавейшых пытанняў, характарызуючых работу прадпрыемства.

За ліпень аўтаматы, страціўшы **331** гадзіну, сталі з-за дрэннага рамонта **48** гадзін, з-за гарэнняў—**24** гадзіны, з-за цэхавых паўхільнак—**261** гадзіну. У жніўні з **229** гадзін прастоя **58** падае на пелхайны рамонт, **37** гадзін — на адсутнасць пара, **9** гадзін — на гарэнне і **125** гадзін — на міжцэхавыя чэпуняні.

Гэтыя лічбы гаворыць аб барбарскіх адносінах да машын і аўтаматаў, аб дрэнным рамонце. Той-жа факт, што на «Пролетарскай перамозе» няма планава-пэнераджальнага рамонта, гаворыць сам за сябе.

Вялікая колькасць выпадкаў гарэння—гэта выключны рэзультат тэхнічнай неабазнанасці рабочых. Цэпер на «Пролетарскай перамозе» амаль 50 проц. рабочых упяршыню папалі на вытворчасць, а навучанне іх на стаўлена зусім дрэнна.

І, нарэшце, гэтыя міжцэхавыя паўхільнікі—выключны рэзультат пагумелай пабудовы тэхналагічнага працэса, рэзультат той блытаніны, якая панае ў цэхах «Пролетарскай перамогі».

Вось што хаваецца за сцэ[illegible] «Пролетарскай перамогі», на якіх [illegible] шчыты з лозунгамі аб базным уключэнні ў перадкастрычніцкую пераклічку.

Б. Род.

П. ГОРЫН

КРЫЗІС КАПІТАЛІЗМА І ЗАГНІВАННЕ БУРЖУАЗНАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ

(Аб VII міжнародным кангрэсе гісторыкаў)

VII міжнародны кангрэс гісторыкаў, які адбыўся ў Варшаве, будучы самым шматлікім з усіх кангрэсаў, у той-жа час яркай другіх прадэманстраваў бездапаможнасць буржуазнай навукі выйсці з тупіка. Буржуазны свет узмоцнена рыхтаваўся да гэтага кангрэса. Невыпадкова ў кангрэсе прымаў удзел рад дзеячаў з буйным палітычным імем: сярод звыш 1.000 дэлегатаў кангрэса, прадстаўляўшых каля 40 дзяржаў, многія і на сёмым дзень з'яўляюцца членамі ўрада. На афіцыяльных банкетах кідаліся ў вочы шматлікія ордэны і высокія званні, даказваючыя адданасць іх уласнікаў справе буржуазіі, іх гатоўнасць служыць гэтай справе верай і праўдай. Седзячы на такім банкеце, можна было падумаць, што знаходзішся прыкладна на кангрэсе Лігі нацый. І гэта ўражэнне, бадай, не было-б памылковым, бо па сутнасці VII міжнародны кангрэс гісторыкаў з'яўляўся міжнародным з'ездам інтэлігенцыі Лігі нацый, напрабаваўшай тут гістарычна ўгрунтаваць дзейнасць сваіх урадаў. Гэта, улесна, было нават традыцыяй кангрэсу гісторыкаў. Даводзі напомніць, што міжнародны гістарычны камітэт, прадстаўляючы сабой на сутнасці адзін з аддзелаў Лігі нацый, праводзіў V кангрэс у Брусэлі, каб туды не былі дапушчаны германскія дэлегаты; калі на VI кангрэсе ў Осла была ўлесена прапанова склікаць чарговы міжнародны з'езд гісторыкаў у Варшаве, германскія гісторыкі актыўна запрацавіліся тэтаму, не лічачы магчымым збірацца ў сталіцы пядаўна адноўленай польскай дзяржавы.

Шматлікасць дэлегатаў кангрэса і шырокае прадстаўніцтва на ім буйных грамадзкіх дзеячоў буржуазіі мае свой палітычны сэнс. За работай кангрэса ўважліва сачыў сусветны друк. Афіцыёзная польская газета «Кур'ер паранны» ў дзень адкрыцця кангрэса адкрыта выказала прычыну такой вялікай цікавасці да яго:

«У цяперашні час, — пісала яна, — у перыяд усеагульнага ідэалагічнага хаоса і ўсяжнага рода сацыяльных эксперыментаў, у перыяд, калі грамадскія падпоры, якарыльныя ў будучым да вы канання сваёй ролі, хістаюцца, распадаюцца і становяцца непрыгоднымі для забеспячэння далейшага развіцця цывілізацыі і культуры, у цяперашні час, калі розум распачлёва шукае новых форм чалавечага жыцця,—знаходжання компаса, які ўказаў-бы далейшую ясную дзейнасць, з'яўляецца патрабаваннем выключнай важнасці».

Па сутнасці гэту-ж мысль развіваў у сваім уступным слове на адкрыцці кангрэса і старшыня совета міністраў Польскай рэспублікі пан Енджэевіч. Ён падкрэсліў практычнае і палітычнае значэнне гістарычнай навукі, указаўшы, што наміж людзьмі, робячымі гісторыю, і людзьмі, не вывучаючымі, «існуе незвычайная ўнутраная сувязь» і што «палітыкі і гісторыкі трымаюць руку на пульсе гісторыі». Міжнароднае значэнне кангрэса гісторыкаў было дасягнута ўлічана і польскім урадам, які прымаў вельмі актыўны ўдзел у арганізацыі кангрэса. Дэлегатаў кангрэса акружылі выключнымі клопатамі і ўвагай. На адкрыцці кангрэса прысутнічалі выдатнейшыя прадстаўнікі польскага ўрада на чале з прэзідэнтам Польскай рэспублікі п. Масціцкім. У поўным складзе быў прадстаўлен дыпламатычны корпус. На адкрыцці з'явіліся ваенныя аташэ амаль усіх дзяржаў. Рымскі папа Пій XI паслаў спецыяльнага дэлегата—біскупа Гаддэўскага, напутстваўшага кангрэс «святым словам» і замяўшага, што «наменіж хрыста на зямлі» вельмі цікавіцца гістарычнай навукай; кардынал Какоўскі адслужыў у касцёле св. Яна набажэнства аб паспяховай рабоце кангрэса. Лепшыя журналісты польскага і замежнага друку спяшаліся інфармаваць свае газеты аб ходзе кангрэса.

Але, не гледзячы на ўзорную ўнадворную падрыхтоўку кангрэса, ўсё-ж не ўдалося ўтаіць агульнае буржуазнай навукі, ягадольнай знайсці «компас, які ўказаў-бы далейшую ясную дзейнасць» («Кур'ер паранны»). Трушным пахам шатыхала амаль ад кожнай секцыі кангрэса. Нават многія буржуазныя жуналісты, такія прыкія ў пачатку кангрэса, пад канец яго заявілі і

АБ РАЗМЕРКАВАННІ ЎРАДЖАЮ І ДАХОДАЎ У КАЛГАСАХ ЗА 1933 ГОД

Пастанова калегіі Народнага камісарыята зямляробства БССР ад 15 кастрычніка 1933 года

Размеркаванне ўраджаю і даходаў у калгасах у гэтым годзе, на аснове дырэктыў ЦК і СНК, павінна забяспечыць поўнае і своячасовае выкананне калгасамі ўсіх сваіх гадавых абавязацельстваў перад дзяржавай і стварэнне устаноўленых абавязковых фондаў для ўзмацнення калгасных патроў у размерах, дазваляючых далейшае развіццё калгаснай гаспадаркі.

Размеркаванне натуральнай і грашовай частак даходаў паміж калгаснікамі пасяховае правядзіцца выключна па працаднях у залежнасці ад пасяховасці работы кожнай вытворчай калгаснай брыгады.

Ад правільнага і своячасовага размеркавання ўраджаю і даходаў у калгасах залежыць далейшая барацьба супроць мас калгаснікаў за значэ больш высокае ўраджайнасці і прадукцыйнасці жывёлагадоўлі, далейшае ўмацаванне пастаянных вытворчых брыгад у калгасах, узрост прадукцыйнасці працы калгаснікаў і пасяховае ажыццяўленне лозунга тав. Сталіна—«зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі».

У сувязі з тым, што рад перадавых калгасаў поўнасцю ўжо выканалі абавязковыя пастаўкі збожжа і бульбы дзяржаве і адзін другім віды прадукцыі, устаноўленыя ім па кантрактацыйных дагаворах і планах загатовак, адапляты работ МТС, вярнулі ссуды і замовыя фонды, калегія Народнага камісарыята зямляробства прапануе ўсім калгасам, МТС і праўленням гэтых калгасаў неадкладна правесці ў гэтых калгасах размеркаванне застаючайся часткі прадуктаў ўраджаю паміж калгаснікамі па працаднях.

Калегія Народнага камісарыята зямляробства БССР абавязвае ўсе райсаветы і МТС узмацніць работу ў калгасах, каб у бліжэйшыя дні скончыць на ўсіх калгасах абавязковыя збожжа і бульбапастаўкі і адачу натуральных за работу МТС на ўсіх тых калгасах, якія гэтага яшчэ не скончылі, з тым, каб неадкладна прыступіць да ссыпкі насенных, страхавых і кармовых фондаў і размеркавання ўраджаю паміж калгаснікамі па працаднях.

Для забеспячэння правільнага размеркавання ўраджаю і даходаў у калгасах калегія Народнага камісарыята зямляробства БССР абавязвае ўсе райсаветы, МТС і праўленні калгасаў правесці наступныя мерапрыемствы:

Падлік і праверка працадзён

Не пазней 5-га лістапада гэтага скончыць на ўсіх калгасах поўны падлік працадзён, выпрацаваных кожным калгаснікам з пачатку года да лістапада і затрату працадзён на галіны гаспадаркі.

2. Зрабіць падлік працадзён, якія калгас будзе мець на застаючыяся асенніх работах да канца года ў адпаведнасці з нормамі выпрацоўкі, гадавымі заданнямі брыгад і фактычна застаўшымся для выканання работамі на зяблеву, апрацоўку ільну, догляду жывёлы і іншых работах да канца года.

Зроблены праўленнем калгаса падлік працадзён, якія калгас будзе мець з 1 лістапада да канца года, павінен быць зацверджан на агульным сходзе калгаснікаў.

3. Правяраць па асобных брыгадах запіс працадзён у працоўныя кніжкі і вынесці на відных мясцах спісы навіных працадзён, каб кожны калгаснік мог праверыць правільнасць запіса яго працадзён.

Усялякі пратэсты на няправільнасць запісаных калгаснікам працадзён павінны быць разгледжаны на працяку не больш адного дня праўленнем калгаса з удзелам брыгадзіра.

4. Праверыць правільнасць налічэння працадзён калгаснікам за работу асобнымі брыгадзірамі і адпаведнасць колькасці налічаных усім калгаснікам брыгады працадзён з устаноўленым для брыгады гадавым вытворчым заданнем.

Пры выяўленні фактаў паніжаных расцэнак працы і перапамеранага налічэння працадзён, асабліва калгаснікам, працуючым на асноўных работах калгасай вытворчасці (у полі), зрабіць перагляд працадзён, выправіўшы дапушчаныя памылкі ў адпаведнасці з пастановай НКЗВ ад 4-III 1933 г. «Аб прыкладных нормах выпрацоўкі і расцэнках у працадзенных ўрадах с.-г. работ у калгасах на 1933 год».

5. Праверыць правільнасць налічэння працадзён кіруючым і абслугоўваючым работнікам, і ў тых выпадках, калі яны зроблены на больш высокіх расцэнках, чым прадугледжана ў пастанове НКЗВ, зрабіць адпаведнае зніжэнне налічаных працадзён.

6. Адзак, калегія Наркамзема БССР папярэджвае ўсіх старшынь калгасаў, дырэктароў МТС і загатчыкаў райсаў аб недапушчэнні масавага агульнага перарасхода налічаных калгаснікам працадзён.

Дадатковае налічэнне працадзён калгаснікам паляводчых брыгад рабіць толькі ў тых выпадках, калі ў калгасе падвучай пазнаёмны расцэнкі палявых работ у параўнанні з пастановай НКЗВ ад 4-III 1933 г. і ў выпадку яўнай недаплаты налічаемых ім працадзён у параўнанні з абслугоўваючым складам калгаснікаў, вартаўнікамі, рахункаводамі, складаўшчыкамі і інш.

7. Калегія Народнага камісарыята зямляробства БССР абавязвае ўсе райсаветы, МТС і праўленні калгасаў наўхільна прытрымлівацца ў жыццё указанне ЦК КП(б)Б і СНК БССР, данае ў пастанове ад 9-III 1933 г. «Аб вытворчай брыгадзе», аб тым, што пры атрыманні брыгадай ўраджаю вышэй сярэдняга па калгасу, брыгадзе робіцца налічэнне працадзён у межах да 20 проц. усёй колькасці выпрацаваных працадзён, з адпаведным зніжэннем у тых-жа размерах тым брыгадам, якія далі ўраджай ніжэй сярэдняга па калгасу.

8. Праўленні калгаса, пры непасрэдным удзеле брыгадзіраў, павінна абвесці ніжэйшы работы кожнай асобнай вытворчай паляводчай брыгады і ўстанавіць у залежнасці ад гэтага размер працадзён ці зніжэння колькасці працадзён для кожнай брыгады і брыгадзіра.

Асноўным вымяральнікам для ацэнкі пасяховасці работы паляводчай брыгады з'яўляецца вышэйпаказаная брыгадаю ўраджайнасці на важнейшых культурах. Адзак, побач з гэтым павінны быць улічаны і другія паказальнікі пасяховасці работы брыгады, як якасць апрацоўкі глебы, выкананне задання па агратэхнічных мерапрыемствах, тэрміны правядзення сяўбы і ўборкі, барацьба са спаткамі і інш.

9. Працадні, надбаўленыя адной або некалькімі паляводчымі брыгадам, згодна ўстаноўленых надбавак у процантах, змяншаюцца ў той-жа колькасці другім паляводчым брыгадам з тым, каб агульная колькасць працадзён, выпрацаваных усімі паляводчымі брыгадамі, не павялічвалася.

10. Колькасць працадзён, надбаўленая або зніжаная пастаянай паляводчай брыгадзе ў залежнасці ад пасяховасці яе работы, размяркоўваецца паміж усімі калгаснікамі гэтай брыгады прапарцыянальна колькасці выпрацаваных кожным з іх працадзён па выкананні с.-г. работ на вытворчым участку данай брыгады.

Лепшыя калгаснікі той паляводчай брыгады, якой зніжана колькасць выпрацаваных працадзён за дрэнныя паказальнікі работы брыгады, якія добрасумленна працавалі на працяку с.-г. сезона, акуратна выходзілі на работу і выконвалі Устаўленыя нормы выпрацоўкі, могуць прэміравацца праўленнем калгаса грашыма за лік агульных даходаў.

11. Пры падліку агульнай колькасці працадзён, выпрацаваных на калгасу за год, улічваюцца таксама і працадні, якія налічаны трактарыстам-калгаснікам за работу на трактарах МТС на палях данага калгаса.

Абавязаць дырэктароў МТС не пазней 1-га лістапада паведаміць усім калгасам, на палях якіх працавалі трактарысты, колькасць выпрацаваных апошнімі працадзён у адпаведнасці са зробленым 15-X 1933 г. перапаўлікам працадзён і выпрацаваных на асенніх с.-г. работах, згодна Устаўленых Наркамземам прагрэсіўных расцэнак за ворыва зяблева і расцэнкі норм выпрацоўкі ў тры працадні на іншых работах.

Праўленні калгасаў, у якіх працавалі трактарысты-калгаснікі, абавязаны праверыць прадстаўлены МТС разлік працадзён трактарыстаў у адпаведнасці з фактычна выкананымі імі работамі ў калгасе, зацверджаць гэты разлік на сяджэнні праўлення і ўключыць у агульны падлік працадзён, па якіх праводзіцца размеркаванне даходаў.

Працадні, налічаныя брыгадзірам трактарнага атрада да 1-І 1934 г. у адпаведнасці з «Палажэннем аб трактарысце», зацверджаным НКЗ СССР, выходячы з сярэдняй колькасці працадзён, выпрацаваных трактарыстам даверанай брыгадзіру трактарнай брыгады, з нікіздай 30 проц., павінны быць адлічаны для аплаты іх размеркавання даходу тымі калгасамі, на палях якіх працавалі трактары яго атрада, прапарцыянальна той колькасці працадзён, якая налічана ў кожным калгасе трактарыстам яго атрада.

Гэта колькасць працадзён паведамляецца дырэктарам МТС кожнаму калгасу асабнасова з разлікам працадзён, выпрацаваных трактарыстам.

12. Разам з праверкай і падлікам працадзён правесці ўсе запісы на кіўках калгаса, на прадукцыі ўраджаю, атрыманай у гэтым годзе, вывесці разлікі на заказчыкам: Дзяржбанку і іншым установам і вывесці усе іншыя даходы і расходы калгаса.

13. Абавязаць рэвізійныя камісіі правесці не пазней 1 лістапада поўную праверку наступленняў і расходаванняў сродкаў і прадуктаў, правільнасці і своячасовасці запісаў па кнігах, своячасовую і поўную здачу прадукцыі дзяржаве і натураплаты МТС, своячасовую і поўную выплату дзяржаўных плацяжоў.

Праверыць улік працадзён і запісы выданых калгаснікам авансаў як грашыма, так і натурай, і правільнасці выдачы іх па працадзях і выдаткі на адміністрацыйна-кіруючы персанал калгасаў.

Вынікі праверкі абмеркаваць на пасяджэннях праўлення калгасаў і агульных сходах калгаснікаў.

Размеркаванне натуральнай часткі даходаў

1. Натуральная частка даходаў калгаса складаецца з усёй прадукцыі, атрыманай з ураджаю 1933 г. ад паляводства, лугаводства, садоўніцтва і гародніцтва, і астачы прадукцыі, выдзеленай у мінулым годзе ў страхавы пасенны фонд, якая нескарыстана на гаспадарчыя патрэбы калгаса.

2. Размеркаванне натуральнай часткі даходаў, збожжа, бульбы і кармоў паміж калгаснікамі па выпрацаваных імі працадзях можа праводзіцца ў калгасах толькі пасля выканання гадавых абавязацельстваў калгаса па абавязковых пастаўках дзяржаве і кантрактацыйных дагаворах, адачы прадукцыі ў парадку натураплаты работ МТС, звароту ссуд і ссыпкі насеннага, страхавога і фуражнага фондаў для ўнутрыкалгасных патрэб у наступным парадку:

Размеркаванне збожжа

а) З агульнай колькасці збожжа натуральнай часткі даходаў калгаса адлічваецца колькасць збожжа, здадзага дзяржаве па абавязковых пастаўках і натураплаце работ МТС і звароце пасенных і харчовых пазык мінулых гадоў у тых калгасах, якія іх атрымлівалі.

б) Неадкладна пасля выканання гадавых абавязацельстваў па пастаўцы збожжа дзяржаве, здачы збожжа ў парадку натураплаты работ МТС і звароту пазык, у кожным калгасе павінны быць ссыпаны пасенныя і страхавы фонды.

г) Пасенныя фонды ссыпаюцца ў размерах, поўнасцю забяспечваючых выкананне ўстаноўленага для калгаса плана сяўбы яравых збожжавых культур у весняную пасеўкампанію 1934 г. у адпаведнасці з пастановай ЖАСА ад 11-IX 1933 г. і інструкцыяй Наркамзема БССР па ссыпцы пасенных і страхавых фондаў у калгасах.

Пасенне, затрачанае на сяўбу азімых у восень 1933 г., адлічваецца ад агульнай прадукцыі ўраджаю разам з засяваемай колькасцю насення для выканання плана сяўбы яравых увесну 1934 года.

г) Страхавыя пасенныя фонды страхуюцца для перасева плошчы азімых і яравых культур у выпадку іх пілеві ад вымакання, выпрэвання, паводак і г. д., і расходуецца выключна на перасеў плошчаў зазначаных культур.

Страхавыя фонды пасення стваряюцца шляхам аднаўлення расходаных страхфондаў ранейшай ссыпкі і дадатковай ссыпкі з тым, каб давесці іх, у залежнасці ад ураджаю, да 10-15 проц. гадавой (па азімых і яравых культурах) патрэбнасці ў насенні. На азімых культурах разлік робіцца, выходзячы з плана сяўбы ўвосень 1933 г., а на яравых, выходзячы з плана веснавой сяўбы 1934 г.

д) Фуражны фонд збожжавых культур ствараецца па складзеным кармовым плане калгаса, выходзячы з наяўнасці ў калгасе ўсіх відаў абёмістых збожжафуражных і сакавітых кармоў, з улікам максімальнага скарыстання сіласа і адыходаў малацьбы, з разлікам поўнага забеспячэння кармамі конскага пагалоўя—таварных калгасных ферм і іншай апрамаджанай жывёлы да ўраджаю новых кармоў.

Са стварэнага фуражнага фонда збожжавых культур абавязкова выдзяляецца бранзлявая частка лепшага кармоў жывёлы на весняную пасеўкампанію.

е) Усё збожжа, якое застаецца ў калгасе пасля выканання ім пералічаных вышэй абавязацельстваў і стварэння ўстаноўленага фондаў па ўсіх збожжавых культурах, размяркоўваецца поўнасцю паміж калгаснікамі па працадзях.

Размеркаванне грубых кармоў

а) З агульнай колькасці сена сеяных траў і сенажаняй, азімай і яравой саломы адлічваецца колькасць сена і саломы, якая здана дзяржаве па плану загатовак.

б) Стварэнцца фуражны фонд грубых кармоў (сена, салома, мякіна) для забеспячэння апрамаджанай жывёлы калгаса да ўраджаю новых кармоў.

Са стварэнага фонда кармоў абавязкова выдзяляецца бранзлявая частка лепшага сена для рабочай жывёлы на час веснавой пасеўкампаніі.

в) Уся астатняя частка грубых кармоў (сена, салома, мякіна) пасля адачы дзяржаве і стварэння фуражнага фонда размяркоўваецца паміж калгаснікамі па працадзях.

Размеркаванне бульбы

а) У першую чаргу калгас абавязан выканаць свае гадавое абавязацельства перад дзяржавай на пастаўцы бульбы, здаць бульбу ў парадку натураплаты работ МТС і вярнуць атрыманую ад дзяржавы пасеннабульбу.

б) Пасля гэтага ссыпецца пасенны фонд на бульбе ў размерах, забяспечваючых выкананне плана сяўбы бульбы ўвесну 1934 года.

в) Ссыпецца страхавы пасенны фонд у размеры 20 проц. патрэбнасці ў пасенні.

г) Стварэцца фуражны фонд у размерах гадавой патрэбнасці ў кармах для апрамаджанай жывёлы.

д) Уся бульба, якая застаецца пасля выканання пералічаных абавязацельстваў і стварэння ўстаноўленых вышэй фондаў, павінна быць размеркавана паміж калгаснікамі па працадзях у восень, не дапускаючы шаўтарэння практыкі мінулага года, калі частка бульбы размяркоўвалася вясной.

в) Калегія НКЗВ катэгарычна забараняе ўсім райсаветам, МТС і праўленням калгасаў стварэць у калгасах адміністрацыйным парадкам іншыя фонды, апрача ўстаноўленых абавязковых фондаў, і пратаўце толькі на аснове шырокай масавай работы на пастанове агульнага схода, з удзелам не менш $^{2}/_{3}$ калгаснікаў, стварэць у калгасе і іншыя фонды, як: на павялічэнне непадзельных капіталаў у калгасах, а таксама фонд для аказання дапамогі інвалідам, сем'ям чырвонаармейцаў, на ўтрымане дзіцячых устаноў (ясляй, пляцовак).

4. Устанавіць, што створаны па жаданні саміх калгаснікаў фонд прадуктаў на павялічэнне непадзельных капіталаў павінен быць захаван асобна ад іншых абавязковых фондаў, створаных у калгасе, і грошы, вырученыя ад рэалізацыі гэтых прадуктаў, павінны быць унесены ў Дзяржбанк на бягучы рахунак калгаса на капіталаўкладаннях, са скарыстаннем іх у будучым годзе выключна на мэты, устаноўленыя пры стварэнні гэтага фонда агульным сходам калгаса.

5. Арганізаваць ва ўсіх калгасах пастаянны ўлік і кантроль над расходаваннем фонда прадуктаў, які па пастанове агульнага схода калгаса ствараецца для мэт утрымання дзіцячых устаноў.

Для поўнага забеспячэння прадуктамі харчавання дзіцячых устаноў як замацоўваемых на зіму, так і тых, якія будуць разгружацца ў часе веснавой і ўборачнай кампаніі 1934 г., абавязаць райсаветы, МТС і праўленні калгасаў разгарнуць масавую растлумачальную работу сярод калгаснікаў па прыцягненні для гэтага прадуктаў саміх бацькоў, атрыманых імі па размеркаванні ўраджаю.

6. Абавязаць праўленні калгасаў, каб пры стварэнні, па пастанове агульнага схода калгаснікаў, фонда прадуктаў для дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў і інвалідам былі адразу ўстаноўлены тыя сем'і калгаснікаў, якім будзе аказана дапамога з гэтага фонда.

Катэгарычна папярэдзіць калгасы супроць іжнення, якія ёсць у пасобных месцах, на штучным раздушэнні гэтых фондаў і ад паўтарэння шкадзільнай практыкі, якая мела месца ў асобных калгасах у мінулым годзе, калі такія фонды фактычна з'яўляліся скрытай ліквідацыяй ураўнаўнага размеркавання і выдачы прадуктаў лодырам і прагульшчыкам, якія з-за дрэннай работы не выпрацавалі выстарчальнай колькасці працадзён.

7. Перад прыступленнем да размеркавання ўраджаю збожжавых, пасля выканання абавязковых збожжапаставак, здачы збожжа ў парадку натураплаты работ МТС і стварэння ўстаноўленых абавязковых фондаў, у кожным калгасе павінен быць складзен план размеркавання ўраджаю і даходаў за 1933 г., у якім устанавіцца колькасць збожжа, кармоў, бульбы і грошай, якая павінна быць выдана на кожны выпрацаваны калгаснікам працадзень.

8. Колькасць збожжа і бульбы, прыпадаючая на адзін працадзень, вызначаецца шляхам падзела той колькасці збожжа і бульбы, якая застаецца для размеркавання паміж калгаснікамі пасля выканання абавязкаў перад дзяржавай, стварэння абавязковых фондаў для ўнутрыкалгасных патрэб і адлічэнняў добраахвотных фондаў, створаных па пастанове агульнага схода на ўсю колькасць працадзён, выпрацаваных па калгасу з 1 студзеня 1933 г. да моманта размеркавання, з дадаткам той сумы працадзён, якую па падліку праўлення калгаса, зацверджанаму агульным сходам, калгас будзе мець з моманта размеркавання на ўсіх асенніх работах да канца 1933 г.

9. Выдача на рукі калгаснікам збожжа і бульбы праводзіцца ў размерах з разлікі колькасці працадзён, выпрацаваных кожным з іх з 1-га студзеня 1933 г. да моманта размеркавання.

Тая колькасць збожжа і бульбы, пры падачэнні на працадні, якія будуць выпрацаваны на асенніх работах з моманта размеркавання ўраджаю да канца года, захоўваецца ў калгасе і выдаецца пасля сканчэння гэтых работ па працадзях, выпрацаваных кожным калгаснікам за гэты перыяд.

10. Размеркаванне грубых кармоў праводзіцца па працадзях, выпрацаваных з пачатку года, сярод калгаснікаў, якія маюць у асабістым карыстанні прадукцыйную жывёлу, так і пазанабываючых кароў і дробную прадукцыйную жывёлу, у адпаведнасці з пастановай СНК СССР і ЦК УсеКП(б) і СНК БССР і ЦК КП(б)Б.

Калгаснікам, не маючым прадукцыйнай жывёлы і не набываючым яе, грубыя кармы (сена, салома), належачыя па працадзях, замяняюцца адпаведна іх кошта, улічанага пры адачы працадзён па дзяржаўных цэнах, іншымі відамі натуральнай прадукцыі (малако, гародніна, бульба і г. д.).

11. Забараніць якое-б там ні было абмежаванне выдачы натуры, прыпадаючай на выпрацаваныя працадні лепшым калгаснікам, працуючым на с.-г. вытворчасці (у полі, гародзе, садзе, жывёлагадоўчых фермах, рамонтных майстэрных і інш.) і выпрацоўваючым найбольшую колькасць працадзён.

12. Разам з гэтым калегія НКЗВ прапануе ўсім райсаветам, МТС і праўленням калгасаў праводзіць з усёй строгасцю зацверджанае пастановай III сесіі ЦВК СССР правіла, згодна якога адміністрацыйны апарат калгаса (старшыня, яго намеснік, рахункавод, складаўшчык і загатчык фермы, калі ён адначасова не з'яўляецца брыгадзірам) атрымлівае на турай за выпрацаваныя ім працадні ў размерах, не вышэй устаноўленых для добрых калгаснікаў, працуючых у паляводстве.

Кошт недаатрыманай натуральнай часткі даходаў па выпрацаваных адміністрацыйна-кіруючымі работнікамі працадзён кампенсуецца грашыма, па ўстаноўленай адзінцы працадня ў грашовым выражэнні.

13. Тыя калгаснікі, якія ўступілі ў гэтым годзе ў калгас да часу масавай уборкі ўраджаю і не абагулілі сваіх пасеваў, зробленых імі ў індывідуальным парадку, не ўдзельнічаюць у размеркаванні калгаснага ўраджаю па тых культурах, якія яны не абагулілі. Кошт прадукцыі культур, у размеркаванні якіх гэтыя калгаснікі не ўдзельнічаюць, прыпадаючых на выпрацаваныя імі працадні, аплачваецца грашыма па ўстаноўленай у калгасе адзінцы працадня.

14. Тым калгаснікам, якія абагулілі пасевы, зробленыя імі да ўступлення ў калгас, праўленне калгаса абавязана налічыць працадні за фактычна затрачаную імі працу па падрыхтоўцы глебы і правядзенню гэтых пасеваў у адпаведнасці з устаноўленымі ў калгасе нормамі выпрацоўкі і адзельнымі расцэнкамі работ у працадніх.

Пасенне, затрачанае калгаснікамі на гэтыя пасевы, залічваецца як узнос у пасенны фонд.

Размеркаванне грашовай часткі даходу

1. Пры складанні плана размеркавання даходаў і ўраджаю за 1933 г. кожны калгас павінен склаць фінансавы разлік грашовых паступленняў і выдаткаў за 1933 г. на аснове фактычна паступіўшых ураджаў ад рэалізацыі сваёй прадукцыі, крэдытаў ад Дзяржбанка і іншых грашовых даходаў і паступленняў, выдаткаў на капітальныя ўкладанні і на ўнутраныя гаспадарчыя патрэбы з дадаткам мяркуемых паступленняў і выдаткаў, якія калгас будзе мець да канца года.

2. Грашовымі даходамі калгаса, падлягаючымі размеркаванню, лічацца грошы, атрыманыя ад рэалізацыі прадукцыі ўраджаю гэтага года на абавязковых пастаўках і кантрактацыйных дагаворах, ад прадукцыі, прададзенай у парадку калгаснага гандлю, ад рэалізацыі астачы прадукцыі мінулага года і іншых даходаў гаспадаркі.

3. У першую чаргу з грашовых даходаў калгаса праводзяцца:

а) Усе плацяжы па с.-г. падатку, страхоўцы і крэдытах, якія трэба пагасіць у 1933 г.;

б) аплата МТС за работы, якія згодна дагавора аплачваюцца грашыма;

в) адлічэнне на павялічэнне непадзельных капіталаў, якія складаюцца з сум 10-15 проц. грашовага адлічэння ад дахода і сумы пропаж, вырученых ад рэалізацыі фонда прадуктаў, выдзеленых па пастанове агульнага схода калгаса.

4. Апрача таго, з грашовых даходаў калгаса адлічваюцца:

а) грашовыя выдаткі на капітальныя ўкладанні, якія зроблены за кошт улас ных даходаў бягучага года апрача прадугледжанага;

б) усе зробленыя на працяку года вытворча-гаспадарчыя і адміністрацыйныя выдаткі;

в) узносы, адлічэнні і грашовыя выдаткі, якія ўстанаўляюцца асобнымі пастановамі агульнага схода (на падрыхтоўку кадраў, культбытавыя патрэбы і інш.);

г) сумы для аплаты працадзён трактарыстам, выпрацаваных імі ў даным калгасе, у тых выпадках, калі ў гэтым калгасе прыпадае на адзін працадзень з грашовых даходаў менш 2 р. 50 кап.

5. Уся астатняя сума грашовых даходаў пасля ўказаных адлічэнняў размяркоўваецца паміж калгаснікамі па працадніх.

6. Калегія НКЗВ абавязвае ўсе райсаветы, МТС і праўленні калгасаў правесці канчатковае размеркаванне грашовай часткі даходаў пасля сканчэння гаспадарчага года, але не пазней 10-15 студзеня 1934 года.

7. Не чакаючы агульнага размеркавання грашовых даходаў за 1933 г., праўленні калгасаў могуць выдаваць калгаснікам грашовыя авансы на выпрацаваных працадніх у размерах 20-30 проц. з сум, атрымліваемых калгасам за рэалізаваную прадукцыю.

8. Пры правядзенні канчатковага разліка з калгаснікамі па размеркаванні грашовай часткі даходаў утрымліваюцца ўсе грашовыя авансы, выданыя на працяку года.

Кошт прадуктаў жывёлагадоўлі, набраных калгаснікамі на працяку года, утрымліваецца з іх пры правядзенні канчатковага разліка па размеркаванні грашовых даходаў.

Агульны даход калгасаў і яго размеркаванне

1. Агульны даход калгаса, падлічаны ў грашовым выражэнні, складаецца з усёй колькасці атрыманай прадукцыі ад паляводства, гародніцтва, садоўніцтва, лугаводства, жывёлагадоўлі і інш. галін гаспадаркі, а таксама з грашовых даходаў ад падсобных і прамысловых прадпрыемстваў, набочных заработкаў і ад рэалізацыі астачы прадукцыі 1932 г., якая рэалізавана ў гэтым годзе.

2. Пры падліку сум агульнага даходу ў грашовым выражэнні прадукцыя, рэалізаваная па здачы дзяржаве і ў парадку калгаснага гандлю, улічваецца па фактычнай выручцы, а прадукцыя, здадзеная ў парадку натураплаты работ МТС, выдзеленая ў фонд для ўнутры-гаспадарчых патрэб і падлягаючая размеркаванню паміж калгаснікамі, улічваецца па дзяржаўных загатоўчых цэнах.

Калі ў калгасе выдзелена паводле рашэння агульнага схода частка прадукцыі ў фонд павялічэння непадзельных капіталаў—кошт яе ўлічваецца па канчэнцыўных цэнах, устаноўленых для данай мясцовасці.

3. Даходы калгаснікаў, атрымліваемыя імі на работах па-за калгасам (лесазагатоўкі, торфараспрацоўкі, кампывы важкі і інш.) у даход калгаса не заліч ваюцца.

Уся сума заработка калгаснікаў на гэтых работах пры рабоце без кампенсуцяе ў карысць калгасніка. Пры рабоце на калгасных конях калгаснікі атрымліваюць на рукі ў сваю карысць 75 проц. заробленай сумы, 25 проц. сумы пералічваюцца адпаведнай дзяржустановай на бягучы рахунак калгаса і ўключаюцца ў агульны даход калгаса, які падлягае размеркаванню.

Налічэнне працадзён калгаснікам за работу ў адыходніцтве забараніцца.

4. У агульны даход калгаса не ўключаецца кошт прыплода жывёлы, якая накідваецца ў гаспадарцы для павялічэння калгаснага стада, кошт прыросту жывёлы, кошт набытых калгасам сродкаў вытворчасці, рабочая і прадукцыйная жывёла, машыны і інвентар, кошт новых пабудоў і капітальнага рамонта.

5. Агульны даход калгаса, падлічаны ў грашовым выражэнні, размяркоўваецца наступным чынам:

а) адлічваюцца сумы с.-т. падатка, страхоўкі і плацяжоў па крэдытах у 1933 г.;

б) адлічваецца сума кошта створаных насенных і кармавых фондаў;

в) пакрываюцца грашовыя выдаткі на капітальныя ўкладанні, зробленыя за кошт уласных даходаў бягучага года;

г) робіцца адлічэнне на павялічэнне непадзельнага капітала ў 1934 годзе.

Для павялічэння непадзельнага капітала адлічваецца сума кошта таго фонда прадукцыі, які выдзелен для гэтай мэты пастановай агульнага схода.

Апрача таго робіцца грашовае адлічэнне ў непадзельны фонд у размерах 10—15 проц. ад сумы агульнага даходу, за вылікам з яе сум па аплату с.-г. падатка, страхоўкі і плацяжоў па крэдытах і сумы кошта насенных і кармавых фондаў.

Сума 10—15 процантнага адлічэння ў непадзельны фонд можа быць паводле рашэння агульнага схода паменшана на суму грашовых выдаткаў на капітальныя ўкладанні, якія зроблены па працяку 1933 г. за кошт уласных даходаў.

Астача сумы адлічэнняў у непадзельны фонд пасля пакрыцця грашовых выдаткаў на капітальныя ўкладанні таксама як і сума грошай, вырученых ад рэалізацыі створанага на пастанове агульнага схода прадуктовага фонда, уносіцца на бягучы рахунак у Дзяржбанку па капіталаўкладаннях.

6. Апроч пералічаных адлічэнняў пакрываюцца з агульнага даходу:

а) усе вытворча-гаспадарчыя выдаткі, як напрыклад, кошт прадуктаў па натураплаце работ МТС, кошт прадукцыі, выдзеленай на гаспадарчыя патрэбы, розныя ўзносы і адлічэнні, грашовыя выдаткі, устаноўленыя спецыяльнымі пастановамі агульнага схода;

б) кошт прадуктовых фондаў, створаных па пастанове агульнага схода на дапамогу інвалідам, сем'ям чырвонаармейцаў і на ўтрымане дзіцячых устаноў;

в) сумы для аплаты грашовых даўгоў калгаса апрача плацяжоў па крэдытах.

7. Астача сумы агульнага даходу калгаса пасля выліку з яго ўстаноўленых адлічэнняў і пакрыцця вышэйпералічаных выдаткаў размяркоўваецца паміж калгаснікамі па працадніх.

Гэтая сума складаецца з кошта прадукцыі ўраджаю, якая размяркоўваецца з натуральнай часткі даходаў паміж калгаснікамі, кошта выданых калгаснікам на працяку года прадуктаў жывёлагадоўлі і сумы грашовай часткі даходаў, якая размяркоўваецца паміж калгаснікамі.

8. Ацэнка аднаго працадня ў грашовым выражэнні вылічваецца шляхам падзела астачы сумы агульнага даходу, якая размяркоўваецца паміж калгаснікам на ўсю колькасць працадзён, выпрацаваных калгаснікамі з 1-га студзеня па 31-га снежня 1933 года.

Справаздачнасць па размеркаванню ўраджаю і даходаў

1. Складзены ў кожным калгасе план размеркавання ўраджаю і даходаў за 1933 год павінен быць шырока абаворан на праўленні калгаса разам з актывам, на вытворчых нарадах у брыгадах і зацверджан агульным сходам калгаса.

2. Зацверджаны агульным сходам калгаснікаў план размеркавання ўраджаю і даходаў, замацаваны подпісамі старшыні і членаў праўлення калгасу з'яўляецца асноўным дакументам для правядзення разліку па размеркаванні даходаў з калгаснікамі па выпрацаваных імі працадніх.

3. План размеркавання ўраджаю і даходаў складаецца ў 3-х экземплярах, з якіх адзін застаецца ў калгасе, а два другіх з далучэннем выпіскі з пратакода агульнага схода, падпісаны прэзідыумам схода, дасылаецца ў МТС па калгасах, абслугоўваемых МТС, і ў райсаветы па астатніх калгасах.

Пасля праверкі райсаветам і МТС складаных калгасамі планаў размеркавання ўраджаю і даходаў адзін экземпляр з надпісам аб зацвярджэнні яго агульным сходам і праверкі райсаветы ці МТС дасылаецца ў Наркамзем БССР.

4. Калегія НКЗВ абавязвае ўсіх заг. райсаветы і дырэктароў МТС арганізаваць работу па складанні плановаў і непасрэднаму размеркаванню так, каб быў забяспечан у кожным калгасе ўдзел прад стаўніка райсаветы і МТС і каб нагляд і праверка правільнасці размеркавання даходаў праводзілася непасрэдна ў калгасах.

Арганізацыйна-масавыя мерапрыемствы

1. У мэтах забеспячэння своячасовага і правільнага правядзення размеркавання ўраджаю і даходаў і належнага кіраўніцтва калгасамі ў правядзенні гэтай адказнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі — Калегія народнага камісарыята зямляробства БССР абавязвае ўсе райсаветы, МТС і праўленні калгасаў правесці наступныя мерапрыемствы:

а) правесці ва ўсіх раёнах да 1-га лістапада 1933 года разам з РК КП(б)Б і палітаддзеламі МТС спецыяльныя інструкцыйныя нарады старшынь калгасаў, старшынь рэвізійных камісій аб парадку і прыёмах размеркавання даходаў і ўраджаю;

б) арганізаваць шырокую прапрацоўку пастановы ЦК і СНК і Наркамзема аб парадку размеркавання даходаў і ўраджаю ў калгасах на вытворчых нарадах у брыгадах і на агульных сходах калгаснікаў, для чаго райсаветы і МТС забяспечыць пашыраную работнікаў у калгасы для правядзення гэтай работы;

в) для аказання рэальнай дапамогі праўленням калгасаў і кіраўніцтва правядзенням размеркавання даходаў і ўраджаю прымацаваць да групы 5-7 калгасаў па адному работніку з кіруючага склада райсаветы, МТС і іншых раённых арганізацый з тым, каб гэтыя работнікі засталіся ў калгасах да поўнага сканчэння работ па размеркаванні даходаў;

г) арганізаваць шырокі ўдзел і дапамогу ў размеркаванні даходаў у калгасах з боку настаўнікаў, рахункових работнікаў раёна, сельсавета, сельскагаспадарчага таварыства і інш. культурных сіл раёна і вёскі.

2. Даручыць усім райсаветам, МТС і праўленням калгасаў правесці ў кожным калгасе спецыяльны дзень, прысвечаны размеркаванню ўраджаю, прыўрочаны да масавай выдачы ўраджаю ўсім калгаснікам.

Правесці ў гэты дзень спецыяльны ўрачысты сход усіх калгаснікаў з шырокім удзелам аднаасобнікаў і серадняковых бліжэйшых вёсак. Паставіць на гэтым сходзе даклад праўлення калгаса аб дасягненнях калгаса, разультатах барацьбы за высокі ўраджай, за своячасовае выкананне абавязкаў перад дзяржавай, з выпускамі размеркавання ўраджаю, перспектывамі далейшага развіцця гаспадаркі, культурнага роста калгаснікаў і рэальным паказам перавагі калгаснага лада перад аднаасобным.

Арганізаваць выступленні лепшых брыгад і асобных калгаснікаў ударнікаў з паказам лепшых узораў работы і дасягненняў у выкананні лозунга т. Сталіна аб заможнасці калгаснікаў.

3. Арганізаваць спецыяльны выпуск насценгазет у калгасе з паказам разультатаў гаспадарчага года, з запісяенем прозвішчаў калгаснікаў сапраўдных ударнікаў калгаснай вытворчасці, а таксама гультаёў і прагульшчыкаў, з выпускамі размеркавання ўраджаю.

4. Калегія НКЗВ напярэджвае ўсіх заг. райсаветы і дырэктароў МТС, што яны персанальна нясуць адказнасць перад Наркамземам за пасяховае правядзенне ўсіх мерапрыемстваў па размеркаванні ўраджаю і даходаў і што невыстарчальнае правядзенне растлумачальнай работы, падмен самадзейнасці саміх калгасных мас голым адміністраваннем, зацяжка ў выкананні дзяржаўных абавязкаў і размеркаванні даходаў будуць разглядацца, як сабатаж і злачынства, накіраванае на зрыў мерапрыемстваў партыі і ўрада па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў і невыкананне лозунга тав. Сталіна аб тым, «каб зрабіць усе калгасы большэвіцкімі і ўсіх калгаснікаў заможнымі».

5. Калегія НКЗВ падкрэслівае палітычную важнасць справы пасяховага правядзення размеркавання ўраджаю і неабходнасць рашучай барацьбы з кулаком і яго агентурай у калгасе супроць кулацкага сабатажа выканання дзяржаўных абавязкаў і агітацыі за размеркаванне ўраджаю да здачы прадукцыі дзяржаве і кулацкага ўраўнальнага размеркавання даходаў і ўраджаю без уліка колькасці і якасці работы паасобных калгаснікаў і брыгад.

Калегія НКЗВ патрабуе ад заг. райсаветы пільнасці, выразнага і аперацыйнага кіраўніцтва кал

10 ГОД ТУРЭЦКАЙ РЭСПУБЛІКІ

АНКАРА, 28. (БЕЛТА).

Як паведамляе анаталійскае агенцтва, па ўсёй Турцыі ідуць валізарныя падрыхтоўкі да святкавання дзесятай гадавіны Турэцкай рэспублікі.

Усюды трыумфальныя аркі, флагі, ілюмінацыі, лозунгі, плакаты, макеты, якія паказваюць дасягненні новай Турцыі ва ўсіх галінах палітычнага, гаспадарчага і культурнага жыцця.

Выстаўлена шмат лозунгаў аб вызваленні Турцыі ад ярма імперыялізма і супроць лазанскага і севрскага дагавораў. У Анкары прыбывалы паплыў дэлегацый з вяколіц і з самых далёкіх мясцовасцей. Прыбываюць шматлікія атрады скаутаў і вучняў, дэлегацыі сялян, моладзі, фамесніка ў і настаўнікаў. Чакаецца ўсяго каля 80 тыс. удзельнікаў дэлегацый. Сёння прыбылі дэлегацыі з Балгарыі, Грэцыі, Венгрыі і Германіі.

Удзел совецкай урадавай дэлегацыі ў святкаванні дзесяцігоддзя Турэцкай рэспублікі прыцягвае асаблівую ўвагу турэцкай грамадзянскасці і ўсяго насельніцтва.

Турэцкія грамадзяне ў іншых краінах рыхтуюцца ўрачыста правесці гадавіну.

Многія эўрапейскія і амерыканскія газеты прыслалі сваіх карэспандэнтаў. Ніколі яшчэ Анкара не бачыла такой вялікай колькасці замежных журналістаў.

* * *

АНКАРА, 28. (БЕЛТА).

Учарашні вагончык прыём, даны Ісмет-пашой у гонар совецкай дэлегацыі, быў адзначан выключнай сардэчнасцю, праяўленай Ісмет-пашой, членамі турэцкага ўрада, парламенцкімі дэпутатамі і прадстаўнікамі генералітэта тав. Варашылаву і іншым членам дэлегацыі.

Тав. Варашылаў быў у цэнтры ўсеагульнай увагі. Ён яго увесь час жававыя тутарскі з Ісмет-пашам і іншымі членамі турэцкага ўрада, дэпутатамі, вяснымі і прадстаўнікамі дыпламатычнага корпуса. Сёння ўранку ў Анкару прыляцелі тры самалёты, надораныя совецкім урадам Турцыі, з прычыны дзесяцігоддзя Турэцкай рэспублікі.

На аэрадроме прыляцеўшых совецкіх лётчыкаў віталі Фуат-бей — старшыня аэранаўтычнай Лігі, нам. начальніка генеральнага штаба і вышэйшыя чыны штаба і міністэрства нацыянальнай абароны.

Вылеценўшы насустрач совецкім самалётам турэцкая эскадрылья вітала совецкіх лётчыкаў перад іх пасадкай. На аэрадроме шматтысячны натоўп наладзіў авацыю совецкім лётчикам.

* * *

АНКАРА, 29. (БЕЛТА).

Анаталійскае агенцтва паведамляе:

«Учора адбыўся прыём у совецкага пасла ў Турцыі Сурыца. На прыёме прысутнічалі: старшыня нацыянальнага схода, старшыня совета міністраў, члены ўрада, генеральны сакратар народнай партыі, дэпутаты парламента, дыпламатычны корпус, прадстаўнікі генеральнага штаба, міністэрства нацыянальнай абароны, міністэрства замежных спраў і прадстаўнікі прэсы».

* * *

АНКАРА, 28. (БЕЛТА).

Турэцкія газеты прысвяцілі першыя старонкі совецкай урадавай дэлегацыі. Газеты змяшчаюць прывітальныя артыкулы, партрэты т. т. Варашылава, Карахана і Будзённага, здымкі іх прыезда і сустрэчы з турэцкімі палітычнымі дзеячамі.

«Джунхусіет» змясціла сімвалічны малюнак: Турцыя і СССР прадстаўлены ў форме алегарычных фігур, націскаючых адна другой руку.

Другая газета дае ілюстрацыю: турэцкі селянін вітае набратаўшыхся чырвонаармейца і аскера. У яркіх падрабязных апісаннях прыезда совецкай урадавай дэлегацыі падкрэсліваецца аканомы ёй сардэчны прыём і грандыёзныя дэманстрацыі насельніцтва ў гонар дэлегацыі.

Юнус Надзі ў «Джунхурыет», віталочы совецкую дэлегацыю, спыняецца на гістарычных карэннях совецка-турэцкай дружбы: звяржэнні султаната ў Турцыі і царызма ў Расіі і на барацьбе СССР і Турцыі з агульным ворагам.

«Зараз, — піша Юнус Надзі, — мы ўспамінаем з глыбокай удзячнасцю дапамогу, якую аказвае Турцыі дружба СССР. Нехай СССР заўсёды лічыць Турцыю сваім вёрдым аплотам. Гэта дружба — галоўны фактар міра за Усходняй Эўропе».

ПРАВАКАЦЫІ БЕЛАГВАРДЗЕЙЦАЎ У ХАРБІНЕ

ХАБАРАЎСК, 29. (БЕЛТА).

У сувязі з апублікаваннем у найбольш буйных англійскіх газетах, што выдаюцца ў Кітаі, у тым ліку у «Пекінь-Цянцзін таймс» сенсацыйных паведамленняў аб захвале рус кімі фашыстамі ў Харбіне французска га грамадзяніна піянїста **Каспе**, белагвардзейскае гвалтаў у Харбіне перапалохалася, чакаючы «прыкрых непрыемнасцяй», для ўсёй белай эміграцыі па Далёкім Усходзе.

Паводле атрыманых тут даных, захват сапраўды зроблен белагвардзейскай арганізацыяй рускіх фашыстаў у Харбіне, працуючых пад кіраўніцтвам царскага генерала Косьміна і яго намоўніка Радзаеўскага.

Палікцыя, а таксама блізкія захваченага вялікі добра ведаюць, у чыіх руках знаходзіцца Каспе. Аднак, вызваліць арыштаванага пры дапамозе паліцыі баяцца, бо налётчыкі пагражаюць, што ў гэтым выпадку ў апошні момант яны прыкончаць свайго палонніка.

Перад пагрозай немінучых выкрыццяў, паводле парады японцаў, жадаючых выратаваць твар «баявога» генерала ад крымінальнага скандала, Косьмін адмовіўся ад годнасці «прэзідэнта фашысцкай партыі».

Белагвардзейцы маюць намер у выпадку, калі гнусная дзейнасць Радзаеўскага будзе выяўлена, «адлучыць» яго ад эміграцыі, аб'явіць яго совецкім агентам і апублікаваць у друку, што Радзаеўскі нібыта прыехаў легальна з СССР у 1925 годзе.

Пастаноўлена таксама апублікаваць, што Радзаеўскі нібыта тайна ад Косьміна адправіў 10 белых ахоўнікаў, папаўных у рукі совецкай пагранічнай варты.

Трэба адзначыць, што генерал Косьмін і Радзаеўскі з'яўляюцца далёкаўсходнімі агентамі белагвардзейскага так званага агульна вайсковага саюза.

* * *

ВЛАДЗІВАСТОК.

Аг. «Сімбун рэнго» яўна на заданню вышэйшых органаў дало ў друк паведамленне аб узмоцненай дзейнасці белых арганізацый у Японіі. Пры гэтым агенцтва заяўляе, што «белыя стараюцца стварыць кантакт з урадавымі коламі Японіі і што іх стараннi ўжо маюць значны поспех».

(БЕЛТА).

Усеагульная забастоўка арабаў у Палестыне

ЛОНДАН, 29. (БЕЛТА).

Згодна паведамлення з Палестыны, забастоўка ў **Хайфе**, аб'яўленая ў знак пратэста супроць расстрэла дэманстрантаў-арабаў, пераварылася ва ўсеагульную пасля таго, як да яе далучыліся партовыя рабочыя.

Усеагульныя забастоўкі пачаліся таксама ўчора ў **Ерусаліме, Наблусе і Яффе**. Чакаюцца дэманстрацыі ў **Акры, Газе, Назарэце і Сефедзе.**

Ва ўсіх гэтых пунктах сканцэнтраваны англійскія войскі. Частку раненых у Яффе прышлося эвакуаваць у суседнія гарады, бо больніцы перапоўнены. Усяго збіта 27, паранена—223.

Каірскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што дэманстрацыя пратэста арабаў чакаецца таксама ў **Дамаску** (Сірыя).

Афіцыяльныя крыніцы прызнаюць, што рух арабаў пакіраван не супроць яўрэяў, а супроць брытанскага панавання ў Палестыне.

Англійскі вярхоўны камісар прынёс утора ў Ерусаліме членаў арабскага выканкома. У адказ на іх патрабаванні аб увядненні самакіраўніцтва, ён адказаў, што яно будзе ўведзена, «калі насельніцтва будзе супрацоўнічаць з урадам, і грамадзянскі бяспечнасць будзе гарантавана».

Арабскі нацыянальны камітэт у Англіі паслаў міністэрству калоній пратэст супроць расстрэла арабскіх дэманстрантаў і супроць рэжыму, «які прычыняе пакуты арабскаму народу, складаючаму 73 проц. насельніцтва Палестыны».

НА ПАРОЗЕ ГАЛОДНАЙ ЗІМЫ Ў ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАХ

НЮ-ЮРК. (БЕЛТА).

Паводле слоў ліберальнага штотыднёвіка «Нэйшэн», надыходзячая зіма будзе для беспрацоўных самай цяжкай за гады крызіса. У афіцыяльных спісах атрымліваючых дапамогу ад дабрачынных арганізацый значыцца 15.850 тыс. чалавек, у тым ліку каля 6 мільёнаў дзяцей.

СМЕРЦЬ ПЕНЛЕВЕ

ПАРЫЖ, 29. (БЕЛТА).

Памёр **Пенлеве**. Пенлеве нарадзіўся ў 1863 годзе. Пенлеве быў лідэрам партыі рэспубліканскіх сацыялістаў і адыгрываў буйную ролю ў палітычным жыцці Францыі. З 1910 года ён дэпутат палаты, а ў 1925 годзе — старшыня палаты.

Пенлеве займаў розныя пасады ў французскіх габінетах аж да прэм'ера. У якасці ваеннага міністра Пенлеве правёў рад ваенных рэформ: увядзенне аднагадовага тэрміна службы, мадэрнізацыя ўзбраення і пабудаванне вялікіх умацаванняў на ўсходняй граніцы Францыі.

Сёння, 31-га кастрычніка

рэдакцыя газеты „ЗВЯЗДА" праводзіць

вечар-нараду комсамольцаў, піянераў і беспартыйнай рабочай і вучнёўскай моладзі Менска

НАРАДЖЭННЯ 1917 г.

На нарадзе-вечары за шклянкай чаю будзе абгаворана пытанне **аб XVI гадавіне Кастрычніцкай рэволюцыі".**

Рэдакцыя „ЗВЯЗДЫ" запрашае прыняць актыўны ўдзел у гэтым вечары-нарадзе комсамольцаў, піянераў і беспартыйнай рабочай і вучнёўскай моладзі наступных прадпрыемстваў: ФЗВ „КІМ"—10 чалавек, завод „Комунар"—2 чал., Імя Варашылава—2, імя Мікніова—2, імя Молатава—1, фабрыка „Кастрычнік"—2, завод „Ударнік"—2, ФЗД—2, калас імя Дзяржынскага—1, калас імя ДПУ—1, саўгас імя Ленерта—1, шчотачная фабрыка—2, 26-я ФЗД—2, друкарня імя Сталіна—3.

Персанальна запрашаюцца: пісьменнік—т.т. Лынькоў, Броўка, Янімовіч, Глебка, Кучар і інш. Запрашаюцца: сакратар парткалектыва, сакратар комсомольскага калектыва і дырэктар ФЗВ „КІМ".

Усім запрошаным таварышам рассланы спецыяльныя білеты.

Пачатак роўна ў 7 гадз. вечара, усталёвай друкарні рэдакцыі газ. „ЗВЯЗДА" (Совецкая, 63, уваход са двара).

РЕДАКЦЫЯ „ЗВЯЗДЫ".

Тэлеграма народнага камісара па замежных справах М. М. Літвінава міністру замежных спраў турэцкай рэспублікі Тэфік Рушцю-Бею

МАСКВА 29. (БЕЛТА).

28-га кастрычніка на дарозе ў Вашынгтон народны камісар па замежных справах тав. М. М. Літвінаў звярнуўся да міністра замежных спраў п. Тэфік Рушцю-бея з наступнай тэлеграмай:

«Блаславіце шкадую, што ў дзень вашай вялікай нацыянальнай гадавіны пазбаўлен магчымасці прымаць удзел разам з маімі таварышамі ў адзначэнні падзеі, завяршыўшай слаўную барацьбу турэцкага народа за незалежнасць і мір.

Прайшоўшае 10-годдзе паспяховага развіцця і выдатных дасягненняў вялікай турэцкай рэспублікі з'явілася ў той-жа час дзесяцігоддзем пастаяннага плядатворнага супрацоўніцтва вашых народаў, новыя каштоўныя доказы якога прынёс апошні год.

Гэта супрацоўніцтва з'яўляецца найлепшым залогам будучага совецка-турэцкіх адносін і першаступенным фактарам барацьбы за мір.

Шлю гарачыя пажаданні вашай вялікай краіне. Прашу перадаць мае віншаванні прэзідэнту Газі Мустафа Кемаль-пашы, а таксама старшыні совета міністраў Ісмет-пашы, старшыні нацыянальнага схода Кязім-пашы і шматлікім прыяцелям, якіх я разлічваў злоў сустрэць у Анкары, і прашу верыць у маю нязменную шчырую дружбу.

ЛІТВІНАЎ».

Тэлеграма сакратара ЦВК СССР т. Енукідзе старшыні нацыянальнага схода турэцкай рэспублікі Кязім-Пашы

«Дазволце мне далучыць мае гарачыя віншаванні і сардэчнае прывітанне да гарачых пажаданняў працоўных мас Союза ССР турэцкаму народу, стварыўшаму 10 год таму назад сваю незалежную нацыянальную рэспубліку. Гераічная барацьба турэцкага народа, гістарычная дзейнасць яго правадыра Газі Мустафа Кемаль-пашы, бліскучыя працы ўрада і вялікага Нацыянальнага схода справядліва выклікаюць радасць ва ўсіх нас — верных прыяцеляў турэцкага народа.

Моцна націскаю руку нашым турэцкім прыяцелям, пядаўна паведаўшым нашу краіну, у дзень іх нацыянальнага свята, жадаю далейшых поспехаў у творчай рабоце, так неабходнай і карыснай для ўмацавання дружбы паміж нашымі народамі.

ЕНУКІДЗЕ».

СССР І ЛАТВІЯ

РЫГА. (БЕЛТА).

Сёння паўнамоцны прадстаўнік СССР у Латвіі тав. **Брадоўскі** прыняў прадстаўнікоў латвійскага друку.

У гутарцы т. Брадоўскі ўказаў, што Совецкі саюз быў першай дзяржавай, неадкладна і безагаворачна прызнаўшай правы Латвіі на незалежнае існаванне. Зараз задачай СССР і Латвіі з'яўляецца заключэнне новага гандлёвага дагавора.

«Можна спадзявацца, — заявіў паўпрэд,—што пры наяўнасці добрай волі з таго і другога боку, гэта пытанне будзе выгадна здавальняюча».

У заключэнне тав. Брадоўскі выказаў надзею, што і латвійскі друк аказа сваю садзейнасць справе латвійска-совецкага збліжэння.

ТАВ. ЛІТВІНАЎ У НЕЙРАТА

БЕРЛІН. (БЕЛТА).

Агенцтва Вольф паведамляе, што вчаў паведаў міністра замежных спраў «Нарком замежных спраў СССР Літ- Нейрата».

Аб правядзенні XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі

Пастанова ЦК КП(б)Б

«Лепшы спосаб адсвяткаваць гадавіну вялікай рэволюцыі—гэта сканцэнтраваць увагу на вывярэнасных задачах яе» (Ленін). Гэта ленінскае указанне павінна быць пакладзена ў аснову работы ўсіх партыйных, прафесіянальных, совецкіх і комсамольскіх арганізацый па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі. Прыйсці да юбілея Кастрычніка з датэрміновым выкананнем дзесяцімесячнага плана прамысловасці БССР, з поўным выкананнем абожжапаставак і завяршэннем усіх сельска-гаспадарчых работ—важнейшая задача ў падрыхтоўцы да святкавання.

Выходзячы з гэтага, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Прапанаваць усім ГК і РК КП(б)Б, палітаддзелам МТС і саўгасаў разгарнуць шырокую агітацыйную і арганізацыйна-масавую работу па падрыхтоўцы да святкавання XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі. Асноўным зместам усёй палітычна-масавай работы павінна быць папулярызацыя ролі нашай партыі ў барацьбе, пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна, за Кастрычніцкую рэволюцыю, папулярызацыя сусветна-гістарычных поспехаў у барацьбе за перамогу соцыялізма, дасягнутых рабочым класам СССР у саюзе з працоўным сялянствам, пад кіраўніцтвам УсеКП(б) на чаю з лепшым прадаўжальнікам справы Леніна—т. Сталіным.

Падрыхтоўка і правядзенне святкавання павінны праходзіць пад знакам яшчэ большага згуртавання вакол нашай партыі і яе ленінскага ЦК, на чале з т. Сталіным, пад знакам неаслабнай барацьбы з ухілам ад генеральнай лініі партыі і ўзмацнення рэволюцыйнай класавай пільнасці ўсіх звенняў партыйных, совецкіх і грамадскіх арганізацый.

2. Райкомам і гаркомам КП(б)Б, прафарганізацыям і комсамолу арганізаваць шырокую палітычна-масавую работу вакол прынятага выказка перадавых прадпрыемстваў Саюза аб сустрэчы Кастрычніцкіх свят рапартамі новых вытворчых перамог. У сувязі з гэтым ЦК КП(б)Б прапануе разгарнуць соцспаборніцтва паміж вытворчымі брыгадамі на заваяванне лепшымі брыгадамі, цэхамі права назвы імя XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі, на атрыманне прадпрыемствамі пераходнага сцяга ЦК КП(б)Б і ЦСПСБ за лепшае выкананне прамфінплана ка ўсіх паказальніках.

Гаркомам і райкомам КП(б)Б разам з прафарганізацыямі ў парадку падрыхтоўкі да ўсебеларускага злёта ўдарнікаў па якасці правесці да 2 лістапада гарадскія і раённыя злёты ўдарнікаў якасці над лозунгам барацьбы за пярэдніцтва ў падрыхтоўцы да XVI гадавіны Кастрычніка.

3. Прапанаваць усім ГК і РК КП(б)Б, палітаддзелам МТС і саўгасаў усю падрыхтоўчую работу да скліканага ў Кастрычніцкія дні ўсебеларускага злёта лепшых калгаснікаў-ударнікаў, старшынь і брыгадзіраў калгасаў, старшынь сельсоветаў, рабочых-ударнікаў саўгасаў і МТС—сканцэнтраваць на завяршэнні асноўных сельска-гаспадарчых кампаній да Кастрычніцкіх свят, на лепшай арганізацыі работ па ільнаапрацоўцы, ільнавагатоўках, на сустрэчы ў поўнай гатоўнасці зімы, на арганізацыі культурнага жыцця калгаснікаў і на падрыхтоўцы ўжо зараз да вясны будучага года з тым, каб 1934 год быў годам новага, рашучэйшага ўздыма ў барацьбе за большэвіцкія калгасы, за замоцнае і культурнае жыццё калгаснікаў.

4. Патрабуючы максімальнай увагі да культурна-бытавога абслугоўвання рабочых, ЦК прапануе ГК і РК КП(б)Б, гарсоветам і РВК усямерна павысіць барацьбу за чыстую і падрыхтаваную да зімоўкі кватэру рабочага і ўжэйшага працоўнага, за лепшае камунальнае абслугоўванне камгасамі, жытрэстамі і жакатамі сваіх жыхароў, за чысты цэх і двор прадпрыемства.

5. Абавязаць усю сетку партыйна-комсамольскай асветы, клубы, тэатры, школы, бібліятэкі ў падрыхтоўцы да Кастрычніцкага юбілея асаблівы ўпор зрабіць на растлумачэнне і папулярызацыю ў масах дасягненняў гаспадарчага і нацыянальна-культурнага буцаўніцтва БССР, якая пры брацкай дапамозе Совецкага саюза дзякуючы правільнай ленінскай нацыянальнай, ператвараецца пад кіраўніцтвам УсеКП(б) у квітнеючую соцыялістычную рэспубліку.

Усю падрыхтоўчую работу да Кастрычніцкіх свят спалучыць з узмацненнем інтэрнацыянальна-выхаваўчай работы, з барацьбой за высокую якасць вучобы і выкладання ў школах, за лепшую пастаноўку палітэхнічнага навучання ў школах, за лепшую палітычна-масавую работу клубаў, тэатраў, бібліятэк.

Райкомам і гаркомам КП(б)Б арганізаваць з 31 кастрычніка па 6 лістапада правядзенне гутарак на прадпрыемствах, у саўгасах, калгасах, МТС і адпаасобнікамі аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР, аб поспехах нацыянальна-культурнага будаўніцтва БССР і ка гісторыі Кастрычніцкай рэволюцыі.

6. Прапанаваць Культпропу ЦК КП(б)Б і Наркамасветы вызначыць практычныя мерапрыемствы па культурнаму абслугоўванню ў гарадах і раёнах у Кастрычніцкія дні, а гарадскім і раённым кастрычніцкім камісіям распрацаваць дэталёвыя пляны святкавання і апублікаваць іх да 1 лістапада.

7. Прапанаваць Цэнтральнай Кастрычніцкай камісіі абгаварыць пытанне аб парадку правядзення 6 лістапада абяднанага ўрачыстага пасяджання ўсебеларускага злёта рабочых ударнікаў якасці прамысловасці і ўсебеларускага злёта перадавікоў-ударнікаў сельскай гаспадаркі і аб абмене дэлегацыямі ўдарнікаў БССР з буйнейшымі пролетарскімі цэнтрамі СССР па Кастрычніцкім святкаванні.

1-га лістапада ў 6 г. веч., у памяшканні Дома комасветы (былы клуб імя Карла Маркса) склікаецца **АГУЛЬНА-ГАРАДСКІ СХОД ПАРТАКТЫВА.**

У парадку дня даклад **аб міжнародным становішчы.** Дакладчык тав. **Міф.**

Члены ЦК і ГК КП(б)Б, члены прэзідыума ЦКК і гарКК КП(б)Б, члены бюро ЦК ЛКСМБ і ГК ЛКСМБ прасядзяць па сваіх мандатах.

Сакратарам партколектываў і ячэек білеты атрымаць 31-га кастрычніка і 1-га лістапада ў гаркоме КП(б)Б (пакой 45).

Менгарком КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Усебеларускі індустрыяльны тэхнікум будматэрыялаў

абвяшчае набор **на падрыхтоўчыя курсы**

для студзеньскага набора, Прымаюцца асобы, маючыя адукацыю за 6 груп. Заявы прымаюцца да 31-X-33 г. Дакументы тыя ж, што і пры паступленні ў тэхнікум. Інтэрнатам і стыпендыяй прынятыя будуць забяспечаны. Заняткі—з 1 лістапада. Адрас: Гомель, Ветрана, 50.

ДЫРЭКЦЫЯ

ЦЭНТРАЛЬНЫ СОВЕТ ВАЯЎНІЧЫХ БЯЗБОЖНІКАЎ БССР

АДКРЫВАЕ

ЗАВОЧНЫ АНТЫРЭЛІГІЙНЫ ІНСТЫТУТ

(філіял цэнтральнага завочнага антырэлігійнага інстытута пры Наркамасвеце РСФСР

Інстытут мае 3 аддзяленні:

1) **педагагічнае**—павышэнне кваліфікацыі педагогаў у пытаннях антырэлігійнага выхавання ў школе і па-за школай,

2) **масавае** — рыхтуе кіраўнікоў, арганізатараў і актыў ячэек СВБ на прадпрыемствах, калгасах, саўгасах, у Чырвонай арміі, павышае кваліфікацыю работнікаў палітасветных устаноў;

3) **прапагандысцкае** — павышае антырэлігійныя веды комуністаў, комсамольцаў, прафсаюзнага і культасветнага актыву, рыхтуе арганізатараў і сакратароў ячэек СВБ і кіраўнікоў антырэлігійных гурткоў.

Анкеты для паступаючых выдаюцца ў раённых аддзелах Наркамасветы. Запоўненыя і засведчаныя анкеты пасылаюцца па адрасу: г. Менск, Наркамасветы, ЦС СВБ БССР.

АФІЦЫЙНАЯ ТАБЛІЦА выйгрышаў па 3-му ТЫРАЖУ

біспроцентна-выйгрышных укладаў.

Тыраж адбыўся ў г. Менску 24 кастрычніка 1933 г.

У 3-м тыражы дзельнічала 500 рахункаў па ашчадкасах г. Менска.

Разыгрывае 25 выйгрышаў палі на ніжэйпаказаныя №№ рахункаў:

№№ АШЧАДКАС	№№ рахункаў	СУМА ВЫЙГРЫШАЎ	
16	33	750 р.	—
„	80	81 р.	75 к.
„	102	136 р.	65 к.
„	116	50 р.	—
„	156	84 р.	—
„	194	91 р.	80 к.
„	261	5 р.	—
„	324	50 р.	—
„	355	5 р.	—
„	412	7 р.	50 к.
„	453	120 р.	80 к.
„	485	66 р.	65 к.
„	496	6 р.	—
37 (ф-ка Кастрычнік)	7	5 р.	—
„	15	7 р.	50 к.
„	70	5 р.	—
„	103	5 р.	—
„	135	5 р.	—
„	185	5 р.	—
104 (3-д „Комунар")	20	25 р.	—
„	91-а	5 р.	—
3 (гар. пошта)	10	96 р.	80 к.
100 (БДУ)	7	5 р.	—
5 (Ляхаўка)	11-113	5 р.	—
	7-5	25 р.	—

Старшыня тыражнай камісіі **ЭПШТЭЙН.**

Прадстаўнік горКК РСІ **КУРЦМАН.**

Адк. сакратар камісіі **ІЛЛЕЙН.**

АДКРЫТА ПАДПІСКА

на штодзённы журнал

„РАЙОННАЯ и ПОЛИТОТДЕЛЬСКАЯ ПЕЧАТЬ"

ЖУРНАЛ ЦК УсеКП(б).

Журнал разлічан на раённы партыйны актыў, работнікаў палітаддзелаў МТС і саўгасаў і работнікаў раённых і палітаддзельскіх газет.

Задача журнала: кіраўніцтва раённым і палітаддзельскім друкам і дапамога ў рабоце газет.

Асноўны змест: пытанні партыйнага кіраўніцтва раённым і палітаддзельскім друкам, агляды друку і распрацоўка розных пытанняў работы газет (формы і метады масавай работы газет, работа з селькорамі, пытанні падрыхтоўкі кадраў, арганізацыі работы рэдакцый і г. д.

Журнал будзе выходзіць у двух выданнях.

Другое выданне, разлічанае на рэдакцыі раённых і палітаддзельскіх газет будзе дадаткова ўключаць артыкульны матэрыял, прызначаны для скарыстання ў газетах;

а) артыкулы, якія растлумачваюць важнейшыя пастановы ЦКУсеКП(б) і СНК

б) прапагандысцкі матэрыял па асноўных пытаннях палітыкі партыі, па пытаннях гісторыі, стратэгіі і тактыкі большэвізма;

в) асноўныя матэрыялы для правядзення найбольш важнейшых гістарычных дат і кампаній;

г) артыкулы аб важнейшых падзеях міжнароднага жыцця.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 выданне; на год—7 р. 20 к., на 6 мес.—3 р. 60 к.

На 2 выданне—для раённых газет: на год—96 р., на 6 месяцаў—48 руб.;

для палітаддзельскіх газет: на год—60 руб., на 6 мес.—30 руб. (палітаддзельскія газеты журнал будуць атрымліваць па цэнтралізаванай падпісцы палітвідзелаў).

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях Совецкага саюза лістаносцамі.

Адрас выдавецтва: Москва, 7, Сущевская, 21, издательство ЦК ВКП(б) „КРЕСТЬЯНСКАЯ ГАЗЕТА".

Адрас рэдакцыі: Москва, 7, ул. Коминтерна, 9.

„Чырвоная Зорка". Каса—ад 1 г. дня.	Гукавая камедыя **Прыгожае жыццё** у 6 частках
Кіно Інтэрнацыянал	**ПРЫГОДЫ ПАДКІДЫША** 1-я СЕРЫЯ
ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ кіно-тэатр	Новы гукавы фільм **ПОБАЧ З НАМІ**
Кіно „Пролетарый"	Мастацкі зямежны фільм **Французская лялька** ў 7 частках.
СПАРТАК Каса—з 4-х г. дня.	Замежны мастацкі фільм **ДРУГІ ШЛЮБ** драма ў 8 частках.

Народны суд 3 уч. г. Віцебска, на падставе прыгавора суда ад 7-X-33 г. 1 атр. 196 К. К., абвяшчае грамадзяніна Ганьбаванне вартаўніку Віцебск. Аддзялення Саюзтранса ЗАБОРАВУ Мэйсею Міхалеву за нядбайныя адносіны да аховы даручанай яму маемасці.

Даводзіцца да ведама, што пры лугасе „ЗАГАЛЬЕ" (ст. Урэчча, Любанскага раёна) праводзіцца набор на

КУРСЫ ТРАКТАРЫСТАЎ.

Тэрмін падачы заяў і даведак да 31-X-33 г. Пачатак заняткаў 1-XI-33 г. Тэрмін навучання 5 месяцаў. Курсанты забяспечваюцца інтэрнатам, сталовай і стыпендыяй у памерах 60 руб. у месяц, таксама будуць аплочаны выдаткі па праезду. Пры яўцы на курсы паступаючыя павінны мець даведкі ад с.-совета аб сацтаноўшчы.

Дырэкцыя.

Выдавецтву „ЗВЯЗДА"

ПАТРЭБНА кваліфікаваная машыністка, якая добра ведае беларускую мову. Зварачацца: Совецкая, 63, 2-гі паверх

БАЛАНС гаспадарчых сродкаў

Беларускага дзяржаўнага трэста хімічнай прамысловасці „БЕЛХІМТРЭСТ" на 1 студзеня 1933 г. і параўнанне яго з данымі бухгалтарскага баланса за 1931 г.

АКТЫЎ

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Сума На 1-1-32 г	Сума На 1-1-33 г
(Склад і размяшчэнне сродкаў)		
I. АСНОЎНЫЯ СРОДКІ:		
1. Будынкі і будоўлі вытворч.	574235—	762525—
2. Абсталяван. сілав. установкі, машыны і інструманты	592262—67	895593—72
3. Транспарт	10542—05	9509—10
4. Гаспадарчы інвентар	69042—20	84129—70
5. Запасное абсталяванне	218692—30	300768—52
6. Жыллёвыя, гандлёвыя і інш. невытворч. прызначэння будынкі	61275—86	226087—52
Усяго па I раздзелу	1526050—18	2278604—56
II. ВЫТВОРЧ. ЗАПАСЫ НА СКЛАДЗЕ і Ў ПУЦІ.		
1. Сыравіна, асноўныя і дапаможныя матэрыялы, тара	553937—84	589954—29
2. Паліва	35785—86	23160—33
Усяго па II раздзелу	589723—70	613114—62
III. НЯСКОНЧАНАЯ ПРАДУКЦЫЯ.		
1. Астаткі незавершанай вытворч. і паўфабрыкатаў (сваіх)	143751—70	90461—94
2. Няскончаная капітальн. работы	938723—05	872554—87
Усяго па III раздзелу	1082474—75	963016—81
IV. ТАВАРНЫЯ ЗАПАСЫ.		
1. Тавары і фабрыкаты (на складзе і ў пуці)	153410—28	36214—59
2. Тавары адгружаныя	140641—40	176447—23
3. Матэрыялы для рэалізацыі і неліквіды	—	40262—69
Усяго па IV раздзелу	294051—68	252924—53
V. ГРАШОВЫЯ СРОДКІ.		
1. Разрахунковыя і асобн. рахункі ў крэдытных установах	253943—05	255009—14
2. Каса і грашовыя пераводы	50293—95	15520—
Усяго па V раздзелу	304237—	270529—14
VI. РАЗЛІКІ.		
1. Справаздачныя сумы	7113—87	12751—68
2. Дэбіторы	213942—45	199520—76
3. Разрахункі з бюджэтам (саюзн., рэспубл. і мясцов.)	55968—	—
4. Выдаткі будучых гадоў	60641—69	10580—28
Усяго па VI раздзелу	337666—01	222852—72

ПРАЦЯГ АКТЫВА	Сума На 1-1-32 г.	Сума На 1-1-33 г.
VII. ВЫДЗЕЛЕНЫЯ СРОДКІ.		
1. Каштоўныя паперы	93—77	—
2. Паі, акцыі і ўдзел у інш. аргам.	15000—	82823—10
3. Уклады ў крэдыт. установы		
а) у БДК	13541—88	13541—88
б) у ЦКБ сродкаў ФУБР'а	117195—71	147195—71
в) разлікі з органамі НКФ па адлічэннях з прыбыткаў	414000—	63149—
Усяго па VII раздзелу	559831—36	309709—69
БАЛАНС	4694034—68	4910752—97

ПАСІЎ

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Сума На 1-1-32 г.	Сума На 1-1-33 г.
(Стварэнне і прызначэн. сродкаў)		
I. УНУТРАНЫЯ РЭСУРСЫ.		
1. Статутны фонд у т. л. уласныя зваротныя сродкі	3097142—33	3270942—05
2. Мэтавыя фонды:		
а) фонд амартызацыі	242399—16	261113—18
б) ФУБР	[illegible]—86	146741—06
в) іншыя	7902—08	99258—33
3. Рэзервы	8049—6[illegible]	18963—43
4. Іншыя рэгулюючыя артыкулы	—	103[illegible]
Усяго па I раздзелу	3476054—05	3798109—95
II. ПАЗЫКОВЫЯ СРОДКІ.		
1. Доўгатэрміновыя крэдыты	118400—	141120—87
2. Кароткатэрміновыя пазыкі крэдытных устаноў	120522—29	46000—
3. Разлікі з бюджэтам (саюзн., рэспубл., мясцов.)	33661—58	36715—86
4. Крэдыторы	425827—95	306352—87
5. Даходы будучых год	—	150—
Усяго па II раздзелу	698411—82	529939—60
III. НАКАПЛЕННІ (ПРЫБЫТАК).		
а) папярэднія перыяды	519568—81	—
б) за справаздач. перыяд	—	582702—52
Усяго па III раздзелу	519568—81	582702—52
БАЛАНС	4694034—68	4910752—07

СТРАТЫ — *Рэзультаты гаспадарчай дзейнасці за 1932 г.* — *ПРЫБЫТКІ*

СТРАТЫ	
1. Страты ад ліквідацыі выбыўшай маемасці	36543—45
2. Страты ад стыхійных бядот	10570—02
3. Страты ад спісання безнадзейных даўгоў і за пропускам тэрміну даўнасці	10749—44
4. Процанты ўплочаныя	890— —
5. Іншыя страты	65079—40
6. Страты мінулых год	1460—24
УСЯГО: руб.	125292—55
7. Чысты прыбытак	582702—52
УСЯГО:	707995—07

ПРЫБЫТКІ	
1. Прыбытак ад рэалізацыі тавараў і аказання паслуг	538648—46
2. Прыбытак ад паступлення на безнадзейных даўгах і ад спісання крэдыторскай запазычанасці за пропускам тэрміну іскавай даўн